ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

№ 3 (3411) Субота 4 студзеня 1930 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619,78 кантора—1.

ЦК КП(б)Б. Пленум зацьвердзіў парадак дня, які быў апублікаваны ў друку. Пленум выбраў першым сакратаром ЦК КП(б)Б, членам пленуму, бюро і сакратарыяту ЦК тав. К. В. ГЭЯ. На першым-жа пасяджэньні быў заслуханы дакпад тав. РАЧЫЦКАГА. У канцы пасяджэньня з прывітаньнем пленуму выступіла дэлегацыя рабочых Сормаўскага заводу, які пасылае 100 пепшых рабочых для работы ў калгасы БССР.

Пленум ЦК у адказ на прывітаньні прыняў адозву да Сормаўскіх рабочых і вылучыў дэлегацыю ў складзе т.т. Міцькова, Клімковіча і Бужынскага, яную пасылае ў Сормава для прывітаньня рабочых.

Па-бальшавіцку разгорнем пасеўную кампанію

С.-г. кампанія гэтага году мае выключнае значэньне для ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва. Яна павінна забясьпечыць далейшы і значны крок уперад у справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі (па заданьні СНК БССР 40 проц. пасеўнай плошчы пад калгасамі да канца году). Яна павінна быць скарыстана для якаснага ўзмацненьня існуючых калгасаў і іх пераходу да больш складаных форм. Яна павінна, нарэшце, даць моцны прырост пасеўных плошчаў і значнае павялічэньне ўраджайнасьці.

Усе гэтыя задачы, вялізнай зажнасьці, патрабуюць карэннага перабудаваньня работы нашага апарату, вусім новых ударных тэмпаў работы, мабілізацыі ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый, усёй савецкай грамадзкасьці.

ЦК КП(б)Б даў рад выразных дырэктыў па пытаньні правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

У адозьве ЦК УсеКП(б) да ўсіх партыйных арганізацый гаворыцца, што «работа кожнага камуністага і кожнай партарганізацыі на бліжэйшы час будзе правярацца перш за ўсё, на тым, у якой меры яны змогуць давесьці канкрэтны плян пасеўнай кампаніі да кожнага сяла і калгасу».

Як ажыцьцяўляецца гэта катэгарычная дырэктыва нашымі акруговымі арганізацыямі? У студзені ў БССР пляны павінны былі быць даведзены да кожнага калгасу, с.-г. таварыства і сяла. Студзень наступіў. А некаторыя акругі да гэтага часу не распрацавалі акруговых пляноў.

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» надрукавана тэлеграма з Гомелю аб тым, што акруговы выканком у чацьверты раз адкладаў разгляд акруговага пляну.

У другіх акругах многія раёны таксама не распрацавалі сваіх пляноў. Пры такім тэмпе работы дырэктыва партыі аб пасеўных плянах наўрад ці будзе праведзена ў жыцьцё без спазьненьня.

Паглядзім зараз, як праводзіцца другое вельмі важнае мерапрыемства аб падрыхтоўцы да сяўбы—ачыстка збожжа. Яна павінна была пачацца яшчэ ў кастрычніку. Між тым, да гэтага часу ачышчана толькі 2 проц. пляну. Старыя калгасы і саўгасы, якія павінны былі ўжо закончыць ачыстку свайго насеньня, выканалі яе на 50 проц. Новыя калгасы да гэтай справы нават не прыступілі.

БССР у гэтым годзе будзе адчуваць вялікую патрэбу ў мінэральных угнаеньнях. Завоз з-за межаў БССР задаволіць нашы патрэбы толькі ў нязначных разьмерах. Ва ўвесь рост паўстае перад намі праблема выкарыстаньня мясцовых рэсурсаў, у асаблівасьці торфу і вапны. Гэта праблема можа быць вырашана толькі пры актыўнейшым удзеле савецкай грамадзкасьці. На мясцох-жа кампанія скарыстаньня мясцовых рэсурсаў не разгорнута. Далей агульных гутарак і папяровых плянаў справа не пайшла.

Вельмі кепска з загатоўкай насеньня, асабліва культурных траў. Цяперашнія тэмпы загатовак выклікаюць сур'ёзную пагрозу пасеўнай кампаніі. У гэтым годзе мы падрыхтавалі вялікую плошчу

Недахват насеньня можа сарваць гэта мерапрыемства і моцна адбіцца на далейшым разьвіцьці жывёлагадоўлі. Трэба бесадкладна ўзмацніць загатоўкі насеньня. Трэба скарыстаць надыходзячую пасеўную кампанію і закласьці ў калгасах пачатак уласнага насеннаводзтва.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы партыі пытаньне аб жывёлагадоўлі ня врушана з мёртвага пункту. У гэтым пытаньні панус ўсё яшчэ поўная неразьбярыха.. Прыкладам можа служыць факт вусім нягрунтоўнага і граючага на руку кулаку павышэньня цэн на скаціну ў момант яе ўзмоцненага выкідваньня на рынак. Важнейшая пастанова аб адкорме сьвіней ня выконваецца.

Ня менш дрэнна абстаіць справа з рамонтам сельска-гаспадарчых машын. Рамонтныя майстэрні, якія ёсьць, да гэтага часу яшчэ не прыстасавны для абслугоўваньня арганізаванага сэктару сельскай гаспадаркі. Няма запасных частак. Наркамаем СССР і Наркамшляху СССР вынесьлі пастанову аб прыстасаваньні чыгуначных майстэрань да рамонту машын і падрыхтаваньня запасных частак. Паводле вестак, якія мы маем, беларускія арганізацыі не прыступілі яшчэ да абгаварэньня шляхоў ажыцьцяўленьня гэтае пастановы.

Тут толькі асобныя факты, але і яны гавораць аб недапушчальна павольнай падрыхтоўцы да важнейшай палітычнай кампаніі. Перад намі пастаўлена задача «дабіцца да пасеўнай кампаніі такіх-жа посьпехаў, як і ў хлебазагатоўчай» (з адозвы ЦК УсеКП(б)). Гэту задачу мы вырашым з посьпехам толькі ў тым выпадку, калі мы ўзмоцнім наступленьне на капіталістычныя элемэнты, калі пабальшавіцку ўзмоцнім тэмпы калектывізацыі, калі скарыстаем «усе нормы грамадзкай самадзейнасьці і спаборніцтва».

Усе партыйныя арганізацыі, усе члены партыі павінны памятаць наступны пункт з пастановы апошняга пленуму ЦК УсеКП(б):

«Мабілізуючы сілы рабочае клясы і дабіваючыся найбольшай арганізаванасьці і актыўнасьці рабочай грамадзкасьці ў падрыхтоўчай рабоце, партыя ў падыходзячай пасеўнай кампаніі згуртуе рашаючыя масы сялянства на ажыцьцяўленьне задач гаспадарчага ўздыму і пераходу да калектыўных формаў зямляробства.

Толькі такім чынам, аб'яднаўшы масы бядняцкага і серадняцкага сялянства вакол партыі і саветаў, рабочая кляса зможа забясьпечыць рашучае ўмацненьне сельска-гаспадарчай базы сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і, гэтым самым, забясьпечыць умацаваньне ўсёй справы будаўніцтва сацыялізму».

Наступаюць рашаючыя месяцы сельска-гаспадарчай кампаніі. Вялізарныя задачы, пастаўленыя перад усёй партыяй, перад усімі працоўнымі, абавязваюць. Пераключымся на бавыя ўдарныя тэмпы, на тэмпы, якія адпавядаюць вялікаму паходу за калектывізацыю вёскі.

1½ мільёна рублёў на падрыхтоўку кадраў для калгасаў

Датэрміновы выпуск студэнтаў с.-г. ВНУ і тэхнікумаў

Адкрываюцца курсы на 1.500 кіраўнікоў калгасаў, 700 рахункаводаў і кароткатэрміновыя курсы на 16 тысяч рабочых розных спэцыяльнасьцяй

Пастанова СНК БССР

У сувязі з шырокім тэмпам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і патрэбнасьцю забясьпечыць яе кадрамі СНК пастанавіў правесьці ў 1929-30 годзе наступныя мерапрыемствы:

— Зрабіць датэрміновы выпуск студэнтаў апошняга курсу ўсіх факультэтаў беларускай с.-г. акадэміі, вэтэрынарнага інстытуту, с.-г. тэхнікумаў і прафшкол з такім разьлікам, каб гэты выпуск быў праведзены не пазьней 1-га красавіка 1930 году.

— Скончыць заняткі са студэнтамі прадапошняга курсу с.-г. акадэміі не пазьней 1-га красавіка 1930 году з мэтай максымальнага скарыстаньня іх у надыходзячы с.-г. сэзон.

Для падрыхтоўкі спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі прапануецца НКЗ не пазьней 1-га лютага 1930 году адкрыць аднагадовыя і двухгадовыя курсы на 200 чалавек з ліку практыкаў.

НКЗ разам з НКА даручаецца перападрыхтаваць праз 4-хмесячныя курсы 120 чалавек раённага агра - пэрсаналу сярэдняй кваліфікацыі і 80 чал. вышэйшай, 200 спэцыялістых сельскай гаспадаркі вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі, якія працуюць у розных мясцох не па спэцыяльнасьці.

— Арганізаваць падрыхтоўку інжынэраў - мэханікаў і тэхналёгаў праз 6-цімесячныя курсы на 30 асоб, а тэхнікаў - мэханізатараў і тэхналёгаў праз 4-хмесячныя курсы на 100 асоб. Курсы ўкамплектаваць з найбольш выдатных практыкаў, а таксама і з кваліфікаваных рабочых адпаведных прамысловых прадпрыемстваў.

Арганізаваць дадаткова падрыхтоўку 1.500 кіраўнікоў калгасаў праз 2-хмесячныя курсы.

НКЗ даручаецца арганізаваць 6-цімесячныя курсы для падрыхтоўкі тэхнічных працаўнікоў па зямляўпарадкаваньні ў дапамогу наяўным кадрам спэцыялістых.

НКА і с.-г. наапэрацыі даручана арганізаваць 2-хмесячныя курсы па падрыхтоўцы 700 рахункаводаў для калгасаў і с.-г. капэрацыі.

Белсельтрэсту прапанавана адкрыць тры новыя сельгасвучы з 2-хгадовым курсам навучаньня, 2-хмесячныя курсы па падрыхтоўцы 40 масларобаў і сыраваравараў і 3-хтыднёвыя вячэрнія курсы для рабочых саўгасаў на 1.950 чалавек.

Адначасова НКА, НКЗ, Белкалгассаюзу, Белмалжыпсаюзу, Паляводсаюзу і садова-агароднаму саюзу даручана арганізаваць рад кароткa - тэрміновых курсаў масавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі—вылучэнцаў і кіраўнікоў калгасаў, масларобаў і сыраваравараў, ільнаводаў, загатоўшчыкаў і зборшчыкаў сыру і г. д. — усяго на 16.200 чалавек.

НКЗ і Белкалгассаюзу прапанавана арганізаваць курсы калёнаважатых на 65 чалавек.

НКЗ, Белсельтрэсту, Белкалгассаюзу і іншым гаспадарчым арганізацыям прапануецца пашырыць кантрактацыю студэнтаў вышэйшых с.-г. навучальных устаноў.

У мэтах больш рацыянальнага скарыстаньня спэцыялістых, якія працуюць ва ўстановах, Наркампрацы разам з НКЗ даручаецца распрацаваць пытаньне аб пераводзе магчыма большага ліку гэтых спэцыялістых з апарату ў саўгасы і калгасы.

Дзяржпляну прапанавана распрацаваць пытаньне адносна абавязковай работы па спэцыяльнасьці ў межах БССР стыпэндыятаў усіх с.-г. навучальных устаноў па сканчэньні навучаньня.

Пры НКЗ утвараецца камісія садзейнасьці падрыхтоўцы с.-г. кадраў.

Для ажыцьцяўленьня ўсіх намечаных мерапрыемстваў адпускаецца звыш 1.500.000 рублёў.

На дапамогу параненым і хворым байцом АДУА

Адозва цэнтральнага савету Асоавіяхіму

МАСКВА, 3. Цэнтральны савет Асоавіяхіму выдаў адозву да ўсіх працоўных Савецкага Саюзу, да ўсіх членаў і арганізацый Асоавіяхіму.

У адозьве гаворыцца, што хворыя і параненыя байцы Асобае Далёкаўсходняе Арміі, якім зроблены рад апэрацый, патрабуюць для папраўкі свайго здароўя адпаведнага лячэньня. З прычыны гэтага Цэнтральны Савет Асоавіяхіму, які першым арганізаваў збор сродкаў на падарункі байцом АДУА—асыгнаваў 50 тыс. руб. на куплю ў лепшых санаторыях і курортах Савецкага Саюзу паасобных коек для хворых і параненых байцоў АДУА.

Цэнтральны савет Асоавіяхіму СССР заклікае ўсіх працоўных Савецкага Саюзу і ўсіх членаў Асоавіяхіму адчыніць шырокі збор сродкаў на куплю для параненых і хворых байцоў АДУА адмысловых калектыўных коек у розных санаторыях і курортах Савецкага Саюзу.

****

ШАНТАЖ ПІЛСУДЧЫКАЎ

ВАРШАВА, 1. Польскае міністэрства асьветы падрыхтоўвае праект стварэньня Украінскага інстытуту, які павінен адыграць ролю сурагату Украінскай Акадэміі Навук. У сувязі з такою падрыхтоўкаю варшаўская газэта «АБЦ», выкрываючы палітычны сэнс гэтай камбінацыі, піша: «Назначэньне Юзэфскага на пост міністра ўнутраных спраў, якое супадае з весткамі аб падрыхтоўцы праекту Украінскага інстытуту, узбуджае сур'ёзныя апасеньні. Ранейшая палітычная дзейнасьць Юзэфскага на пасту валынскага ваяводы азначае, што ўрад у сваёй палітыцы ў адносінах да нацменшасьцяй пачынае набліжацца да ранейшае небясьпечнае стадыі блуканьня па імпэрыялістычных ухабах». Падкрэсьліваючы ўзмацненьне проб аднаўленьня пятлюраўшчыны ў тэй, або іншай форме, газэта зазначае, між іншым, што Украінскі інстытут павінен быць процістаўлены, па думцы аўтараў праекту, Украінскай Акадэміі Навук у Кіеве. «Такая проба, — піша «АБЦ», — зьяўляецца сьмешнай і наіўнай».

Трэба падкрэсьліць, што, праектуючы стварэньне Украінскага інстытуту, кіраўнічыя колы вызначаюць для яго месца... Варшаву. Ужо гэты факт характарызуе значэньне будучага Украінскага інстытуту. («Известия»).

Напад сялян на раду з патрабаваньнем падзелу зямлі

ВАРШАВА, 31. З Львова паведамляюць, што ў вёсцы Яснэ Поле некалькі сот сялян напалі на абшчынную раду, разбурылі памяшканьне і паранілі 2-х радных. Сяляне патрабавалі, каб зямля, якая належыць да абшчыны, была падзелена паміж імі. 20 сялян арыштаваны.

Арганізаваць масавую праверку выкананьня прамфінплянаў

Ствараюцца рабочыя брыгады для праверкі

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ

Пазаўчора прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў інфармацыю тав. Розіна аб ходзе выкананьня прамфінплянаў за кастрычнік і лістапад бягучага гаспадарчага году і аб пастановах нарады старшынь ЦП саюзаў, якая адбылася гэтымі днямі.

Прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з прапановай нарады аб **арганізацыі на ўсіх прадпрыемствах масавай праверкі выкананьня вытворчых праграм шляхам арганізацыі для гэтай мэты спэцыяльных рабочых брыгад. Да праверкі павінны таксама быць прыцягнуты часовыя кантрольныя камісіі, ударнікі, вытворчыя камісіі.**

Усім прафарганізацыям прапанавана ў тэрміновым парадку заслухаць даклады гаспадарчых органаў аб ходзе выкананьня прамфінплянаў за кастрычнік і лістапад, заслухаць даклады кіраўнікоў асобных прадпрыемстваў, якія адстаюць у выкананьні вытворчых праграм і наогул увесьці ў сыстему заслухоўваньне штомесячна дакладаў гаспадарчых органаў аб выкананьні вытворчых праграм на пасяджэньнях прафарганізацый і рабочых сходах.

Паколькі ВСНГБ і некаторыя трэсты вылучылі камісіі па праверцы выкананьня вытворчых праграм на асобных прадпрыемствах, прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў ЦП саюзаў вылучыць у гэтыя камісіі і сваіх прадстаўнікоў.

Улічваючы, што перагляд норм выпрацоўкі адыгрывае вялікую ролю ў справе выкананьня вытворчых праграм, прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў усім прафарганізацыям ні ў якім выпадку **не зацягваць перагляду норм, праводзячы гэту работу на аснове прынцыпаў, агавораных у калдагаварох.**

Прэзыдыум ЦСПСВ прызнаў, што да гэтага часу да пытаньня выкананьня прамфінплянаў ня была даволі мабілізавана ўвага шырокіх рабочых мас, у асаблівасьці ўдарнікаў, і што ў радзе выпадкаў ня толькі нізавыя праф'ячэйкі, але і вышэйшыя зьвеньні прафсаюзаў (ЦП мэталістых, дрэваапрацоўшчыкаў і харчавікоў) слаба цікавіліся ходам выкананьня вытворчых праграм за кастрычнік і лістапад.

Прэзыдыум таксама лічыць ненармальным, што да гэтага часу **адсутнічаюць даныя аб зьніжэньні сабекошту па рэспубліканскай прамысловасьці.** Прэзыдыум зьвярнуўся да ВСНГ з просьбай прыняць катэгарычныя меры да зьніжэньня гэтага недахопу.

Гандаль СССР з краінамі Ўсходу

МАСКВА, 3. Ва Ўсесаюзна-ўсходняй гандлёвай палаце падагулены вынікі гандлю СССР з краямі Ўсходу (Пэрсыя, Турцыя, Эгіпэт, Аўганістан, Заходні Кітай, Манголія, Тана-Тува, Кітай і Японія) за 1928-29 год. Увесь зварот с краямі Ўсходу склаў 330.172 тыс. руб., з якіх на экспарт у гэтыя краіны прыпадае 158.426 тыс. руб., а на імпарт з іх —171.746 тыс. руб.

Эканамічны крызіс у Амэрыцы

Скарачэньне гуртовага гандлю

НЬЮ-ЁРК, 1. Фэдэральная рэзэрвовая палата паведамляе, што гуртовы гандаль за лістапад месяц быў на 16.5% ніжэй, чым за кастрычнік і на 3 проц. ніжэй, чым у лістападзе мінулага году. Продаж мужчынскае гатовае вопраткі скараціўся на 45.5 проц., у параўнаньні з кастрычнікам і на 9 проц. у параўнаньні з лістападам мінулага году. Продаж абутку скараціўся на 20 проц. і на 13 проц. адпаведна. (ТАСС).

Лік банкруцтваў павялічваецца

НЬЮ-ЁРК, 1. Эканамічны орган «Уол стрыт Джорнэль» паведамляе, што ў 1929 годзе ў Амэрыцы было 19.703 банкруцтвы. Пасыў фірмаў, якія збанкрутавалі, складае 528.980 тыс. долараў. Лік банкруцтваў у параўнаньні з 1929 годам павялічыўся толькі на 3 проц. Аднак, пасыў фірмаў, якія збанкрутавалі, павялічыўся за гэты год на 21 проц. «Джорнэль» падкрэсьлівае, што найбольшы лік банкруцтваў за год прыпадае на сьнежань месяц.

Эканамічны крызіс ПАЗШ адбіўся і на эканамічным становішчы Канады. За год у Канадзе збанкрутавалі 2.092 фірмы з пасывам у 31.863.932 долары. У параўнаньні з 1928 годам лік банкруцтваў у Канадзе павялічыўся на 11,5 проц., але пасыў зьменшыўся на 12,5 проц. (ТАСС).

***

ВАШЫНГТОН, 1. Кіраўнічыя дзеячы ўраду ПАЗШ, а таксама найбольш выдатныя прадстаўнікі гандлёва-прамысловых колаў выкарысталі новы год для апублікаваньня аптымістычных заяў. Не адстаюць ад прадстаўнікоў ураду і кіраўнікі рэфармісцкай амэрыканскай фэдэрацыі працы, якія ў сваім новагоднім «пасланьні» таксама сьцьвярджаюць, што 1930 год будзе «добрым годам».

Старая песьня цьвёрдалобых

ЛЁНДАН, 2. Карэспандэнт «Таймсу» па рабочых пытаньнях адзначае апублікаваньне ў першым нумары «Дэйлі Уоркэр» (штотыднёвы орган ангельскае кампартыі) адозвы прэзыдыуму Камінтэрну. Карэспандэнт зазначае, што адозва называе «Дэйлі Уоркэр» новаю магутнаю зброяй у руках ангельскіх рабочых для барацьбы супроць капіталізму, рацыяналізацыі і сацыял-фашысцкага ўраду рабочае партыі. «Камінтэрн, —заяўляе далей карэспандэнт,—зьяўляецца агентам савецкага ўраду». Прыпамінаючы, што 20-га сьнежня паміж Англіяй і СССР адбыўся абмен нотамі па пытаньні аб прапагандзе, карэспандэнт піша:

«Трэба прызнаць, што прэзыдыум Камінтэрну знаходзіцца пад простым або ўкосным кантролем савецкага ўраду, што апублікаваную цяпер адозву нельга інакш разглядаць, як парушэньне абавязацельстваў, узятых на сябе менш 2-х тыдняў таму назад».

«Таймс», камэнтуючы у перадавым артыкуле паведамленьне свайго карэспандэнта, піша: «Ангельскаму ўраду ня прышлося доўга чакаць добрасумленнасьці савецкага ўраду па пытаньні аб прапагандзе. Лёст прэзыдыуму Камінтэрну зьяўляецца яскравым узорам бальшавіцкае прапаганды, накіраванае, галоўным чынам, супроць ураду рабочае партыі і лідэраў прафсаюзаў. Гэндэрсон заявіў, што савецкі ўрад узяў на сябе абавязацельствы абмежаваць прапаганду Камінтэрну. Цяпер чарга за Гэндэрсонам, каб выканаць свае абавязацельствы».

Контр-рэвалюцыйная банда „цюрэлеўцаў“

перад Вярхоўным Судом СССР

МАСКВА, 3. У сярэдзіне студзеня вызная сэсія вайсковае калегіі Вярхоўнага Суду СССР будзе слухаць у Ленінградзе справу групы «цюрылеўцаў».

Цэнтральнаю фігураю гэтае групы вьяўляецца былы штаб-ротмістар А. К. Шылер.

У 1922 годзе Шылер паступіў у Далцыту ў манархісцкую арганізацыю «Саюз афіцэраў рускае арміі і флёту», якая падтрымлівала «цюрылеўцаў». З 1922 году Шылер быў адным з бліжэйшых супрацоўнікаў кіраўніка манархістых—«цюрылеўцаў»—генэрала Глазэнапа. У працягу некалькіх год Шылер загадваў пераправачным пунктам у Латвіі, Фінляндыі і Эстоніі, кіруючы перакідваньнем манархічнае літаратуры ў СССР.

У верасьні 1928 году Шылер, паводле даручэньня Глазэнапа, накіраваўся ў СССР. Мэтаю яго пераходу было: 1) вьбіраньне вестак аб эканамічным стане СССР, аб настроях розных груп насельніцтва, аб стане Чырвонае Арміі, 2) стварэньне контр-рэвалюцыйных кадраў у СССР для падрыхтоўкі паўстаньня і 3) пашырэньне фальшывых савецкіх чырвонцаў, з мэтаю падрыву фінансавае магутнасьці СССР.

Стварэньне контр-рэвалюцыйнае групы ён павінен быў праводзіць шляхам вярбоўкі сваіх аднапалчан. Шылер меў з сабою 1.000 фальшывых чырвонцаў.

Прыехаўшы ў Ленінград, Шылер адшукаў сваіх аднапалчан—былых афіцэраў 20-га драгунскага палка, штаб-ротмістра Карташова і карнэта Гайэра. У гутарцы з імі Шылер высьветліў іх анты-савецкія настроі і потым уцягнуў іх у сваю падпольную працу. Карташоў вьяваў Шылера з другім іх аднапалчанінам С. Г. Фядотавым, які таксама, як і першыя двое, згадзіўся на ўдзел у арганізацыі.

Скора Шылер выехаў назад, але ў сярэдзіне лістапада 1928 году зноў нелегальна зьявіўся ў СССР і прывёз з сабою 3.000 фальшывых чырвонцаў. Гэтыя чырвонцы ён пакінуў у Фядотава. Незадоўга пасьля гэтага Шылер і іншыя былі арыштаваны.

Пагромшчыкі перад Вярхоўным Судом БССР

ГОМЕЛЬ, 2. Выязная сэсія Вярхоўнага Суду БССР пачынае заўтра слухаць справу групы кіраўнікоў Гомельскага аддзяленьня саюзу рускага народу. На лаўцы падсудных—кіраўнікі аддзелу—удзельнікі і арганізатары яўрэйскіх пагромаў у Гомелі і інш. гарадох у дарэвалюцыйны час. Сьведкамі выступаюць грамадзяне, якія пацярпелі ў часе пагрому. Працоўныя аддаюць вялікую ўвагу гэтай справе.

Вышэйшая кара за забойства рабкора

БЭРДЫЧАЎ, 2. Вынесены прысуд па справе аб забойстве рабкора Крыніцкага. Следзтва высьветліла ўдзел у забойстве старшыні сельсавету і іншых сельскіх працаўнікоў.

Суд прыгаварыў да расстрэлу 2-х фізычных забойцаў рабкора, а таксама старшыню сельсавету Тордая і старшыню каапэрацыі Палішчука. Іншыя падсудныя атрымалі розныя тэрміны зьняволеньня.

Ангельскі друк аб пастановах усеіндыйскага нацыянальнага кангрэсу

ЛЁНДАН, 2. Камэнтуючы рашэньні ўсеіндыйскага нацыянальнага кангрэсу, «Таймс» заяўляе, што той, хто даўно сачыў за ходам палітычных падзей у Індыі, той не знаходзіць нічога нечаканага ў падзеях, якія мелі месца ў Індыі за апошні тыдзень. Тым ня менш, было-б вялікай памылкай не даадэньваць уплыву партый, якія бяруць удзел у кангрэсе. Бясспрэчна, што кангрэс зьяўляецца прадстаўніком толькі часьці насельніцтва Індыі. Але ў той-жа час кангрэс — буйнейшая і найбольш дзейная прапагандысцкая сіла Індыі, якая ўладае шырокай сеткай мясцовага друку, накіраванага амаль далкам на барацьбу з Англіяй. Гэтыя факты неабходна ўлічыць. Адмову кангрэсу ад супрацоўніцтва ніяк нельга разглядаць як правал прапановы аб скліканьні ангельска-індыйскае канфэрэнцыі. «Прапанова аб скліканьні канфэрэнцыі, піша «Таймс», была зьвернута нядвузначна да практычных дзеячоў - патрыётаў, а не фанатычных рэвалюцыянэраў».

Па думцы кансэрватыўнае «Дэйлі Тэлеграф», раскол, які адбыўся на Лагорскім кангрэсе, мае далёка большае значэньне, чым масавае галасаваньне дэлегатаў за рэзалюцыю Ганды. Рашэньне кангрэсу дае толькі адзін ходкі лёзунг — байкот законадаўчых сходаў. Ліберальная «Манчэстэр Гардыян» лічыць, што рашэньне кангрэсу «будаваць сваю палітыку на пачуцьцях» адкрывае пэрспэктывы для палітычных дзеячоў у Індыі, якія могуць зноў заваяваць кіраўніцтва палітычным жыцьцём Індыі.

Урадавы орган «Дэйлі Гэральд» заяўляе, што Ганды і яго прыхільнікі зрабілі ў Лагоры вялікую памылку. Палітыка, прынятая кангрэсам, адзначаецца бясплённасьцю. Проба ажыцьцяўленьня грамадзянскага непаслушэньства прывядзе да непапраўнага расколу кангрэсу, і кампанія за ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу атрымае няўдачу.

Орган ангельскае кампартыі «Дэйлі Уоркэр» зазначае, што бурныя тоны, у абставінах якіх былі прыняты рашэньні Лагорскага кангрэсу, былі толькі частковым адбіткам магутнага ўздыму рэвалюцыйнага руху індыйскіх рабочых і сялянскіх мас. Буржуазныя лідэры кангрэсу былі вымушаны, пад націскам рэвалюцыйных мас Індыі, зрабіць выгляд, што яны змагаюцца з ангельскім імпэрыялізмам. Ганды, Нэру і Боз — гэта людзі, якія даўно вядомы рэвалюцыйным масам Індыі, як здраднікі. Яны ня раз зрывалі масавую барацьбу рабочых і сялян. Яны прынялі рэзалюцыю ў Лагоры толькі для таго, каб укрыць сваё здраднічтва і утрымаць уплыў на насельніцтва Індыі, які вымыкаецца з

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

10 проц. прэміі ў фонд індустрыялізацыі

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Каморнікі і зямляўпарадчыкі Магілеўскага акруговага зямельнага аддзелу пастанавілі адлічыць 7 проц. прэміі, якая належыць ім за выкананьня ім у 1929 г. работы, на пабудову трактарнай калёны і 3 проц. у фонд індустрыялізацыі. Адлічэньні складаюць каля 15 тысяч рублёў.

Зямляўпарадчыкі Магілеўшчыны выклікалі на спаборніцтва зямляўпарадчыкаў Аршанскай і Гомельскай округ.

Калгас імя газ. „Зьвязда“ у Вузьдзенскім раёне

ВУЗДА (наш кар.). 60 бядняцкіх гаспадарк в. Хароміцкая арганізавалі калгас на плошчы 600 гэкт. Сяляне далі калгасу імя газэты «Зьвязда» і зьвярнуліся да рэдакцыі газэты з просьбай узяць шэфства над калгасам.

Чырвоны абоз дэпэгатак

ПУХАВІЧЫ (наш кар.). Дэлегаткі-калгасьніцы в. Ляддо, Новасёлкаўская сельсавету арганізавалі чырвоны абоз і здалі ў спалывенцкую каапэрацыю 850 гіляў чыгуннага лому і 118 ільну-валакна.

Чырвонаармейская камуна на балоце

ПОЛАЦАК (наш кар.). Чырвонаармейская камуна на Ноўлінскіх балотах, Ветрынскага раёну, расьце з кожным днём. Зараз у камуну ўвайшлі тры вёскі. Да вясны г. г. увойдзе яшчэ 12 вёсак.

На палёх камуны працуе 4 трактары. Маемасьць членаў камуны цалкам аграмаджана.

Дзяржбанк—шэф над агракабінатам

БАБРУЙСК (наш кар.). Калектыў Бабруйскага аддзяленьня Дзяржбанку прыняў шэфства над агра-індустрыяльным камбінатам у Рагачоўска-Жлобінскім раёне суцэльнай калектывізацыі.

Шэфы дапамогуць калгасам наладзіць фінансава-рахунковы апарат, праводзіць падпіску на пазыкі, арганізуюць разрахунковую касу, якая павінна абярнуцца ў фінансавы цэнтр раёну.

Калектыў пасылае некалькі працаўнікоў для пастаяннай работы ў калгасах.

ЗГАРЭЛА МЭБЭЛЬНАЯ ФАБРЫКА МАЗЫР.

(Наш кар.). Згарэла дашчэнту мэбэльная фабрыка «Беларусь». У агні згарэў 1 чалавек. Пры-

Забойства інспэктара крымвышуку

ВІЦЕБСК (наш кар.). 1-га студзеня, а 3 гадз. дня блізка ля гораду пры затрыманьні бандытаў забіты інспэктар крымвышуку Вішняковы.

Забіты доўгі час працаваў у крымвышуку і выкрыў рад бандыцкіх шаек.

Вішнякоў—сын батрака, служыў у органах ЧК.

У дзень сьмерці Вішнякоў толькі вымяніўся з дзяжурства, але не пайшоў дадому, а паехаў затрымліваць небясьпечных бандытаў.

Пад суд—за парушэньне калдагавору

ВОРША (наш кар.). Паводле хадайніцтва Аршанскага акраддзяленьня саюзу дрэваапрацоўшчыкаў, прыцягнуты да судовай адказнасьці дырэктар Аршанскага прамысловага трэсту за невыкананьне абавязкоў дагавору па Аршанскім і Стайкаўскім лесазаводах.

Справа будзе разгледжана ў паказальным парадку на Стайкаўскім лесазаводзе. Адначасова суд разгледзіць справу аб шкодніцтве бронь-вучня Талея, які злучыў электрычныя правады, чым вы-

Партыйнае будаўніцтва

Пільна правярайце партыйныя рады

З лістоў рабкораў аб чыстцы

Праверка ячэек КП(б)Б фабрыкі імя Сталіна і заводу імя Халтурына (Рагачоўскі раён, Бабруйшчына) паказала, што ў практычнай рабоце ячэек ёсьць значныя хібы. Склад партыйных ячэек быў засьмечаны клясава і ідэёва варожымі элемэнтамі, якія былі выкрыты толькі ў часе чысткі.

Адным з самых сур'ёзьнейшых недахопаў у рабоце ячэек зьяўляецца адсутнасьць вярбоўкі рабочых і работніц ад варштату. На фабрыцы імя Сталіна за апошні год толькі два рабочыя падалі заявы ад прыняцьці ў партыю. Іх заявы ляжалі ў справах ячэйкі без усялякага адказу некалькі месяцаў. На заводзе імя Халтурына за год паданы ўсяго 4 заявы, а ў парт'ячэйцы чыгуначнай станцыі вярбоўка зусім адсутнічала. Сакратар чыгуначнай парт'ячэйкі тлумачыць гэта тым, што «няма за лік каго расьці».

Сацыялістычнае спаборніцтва ідзе самацёкам. Парт'ячэйкі не праводзяць ніякай работы ў гэтым напрамку. Фабрыка імя Сталіна адмовілася прыняць выклік на сацыялістычнае спаборніцтва з фабрыкай «Прафінтэрн».

Парткіраўніцтва заводу імя Халтурына парушала дырэктыву партыі аб адзіначальнасьці. Ячэйка займалася адміністрацыйна-гаспадарчымі функцыямі (прыём, звальненьне і г. д.), падмяняючы дырэктара заводу. Парт'ячэйкі не далі бою рвацкім і шкурніцкім настроям, не змагаліся і не рэагавалі на хвасьцісцкія паводзіны і ўчынкі асобных камуністых.

Самакрытыка разгорнута слаба. На заводзе імя Халтурына былі факты яўнага заціску самакрытыкі. Зусім дрэнна разгорнута самакрытыка на станцыі Рагачоў. Чыгуначная ячэйка не забясьпечыла ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб самакрытыцы. Сакратар ячэйкі варожа адносіцца да рабкораўскага руху, заяўляючы, што «ў нас рабкораў няма, а ёсьць склочнікі». І гэта ў той час, калі большасьць заметак рабкораў-чыгуначнікаў аб розных недахопах і хібах і ў тым ліку недахопах сакратара ячэйкі,— пацьвердзілася.

Праверком адзначыў, што па ячэйках КП(б)Б заводу імя Халтурына і фабрыкі імя Сталіна падрыхтоўчая работа праведзена зусім слаба. У сваіх вывадах праверачная камісія, канстатуючы, што выторчая партарганізацыя Рагачоўскага раёну ў асноўным здаровая, прапанаваў правераным ячэйкам зьнішчыць вышэй адзначаныя недахопы ў практычнай рабоце. Асаблівую ўвагу парт'ячэйкі павінны зьвярнуць на вярбоўку рабочых і работніц у рады партыі і кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарным рухам.

ЭРЭНБУРГ.

***

Праверка і чыстка савецкіх і ВНУ ячэек КП(б)Б у **Гомельскай** арганізацыі падыходзіць да канца. Праверены парт'ячэйкі **Белпэдтэхнікуму, чыгуначнага тэхнікуму і Усебеларускай саўпартшколы.** З вынікаў чысткі можна зрабіць некаторыя вывады. У гэтых ячэйках падрыхтоўчая работа была праведзена зусім дрэнна. Нездавальняючая падрыхтоўка адбілася на рабоце праверкому і перашкаджала нармальнаму ходу праверкі. На многіх партыйцаў ня было патрэбных матар'ялаў, аб чым свячасова не паклапаціліся партыйныя ячэйкі. У выніку частка партыйцаў яшчэ і да гэтага засталася неправеранай.

Усяго па 3 ячэйках праверана 150 членаў і кандыдатаў партыі. З іх выключана з партыі 21 чал., 38 камуністых атрымалі партыйныя спагнаньні. Большасьць выключана за ўтойваньне ад партыі свайго пахаджэньня, за дэзэртырства з Чырвонай арміі, п'янства і скажэньне клясавай лініі. Усе гэтыя праступкі рабіліся да паступленьня ў навучальныя ўстановы. Высьветлілася, што многія арганізацыі ведалі аб гэтых праступках, але, ня гледзячы на антыпартыйныя паводзіны і ўчынкі данага партыйца, усё-ж накіроўвалі яго на вучобу. Гэта сьведчыць аб тым, што некаторыя арганізацыі КП(б)Б нядбайна адносіліся да адбору кандыдатаў. У асаблівасьці гэта заўважана ў саўпартшколе, дзе выключана з партыі 15 проц. камуністых. Чыстка прайшла пад знакам праверкі ўсёй партыйнай работы. У ячэйцы саўпартшколы партыйцы, як гэта ня дзіўна, слаба ўсьвядомілі сутнасьць правага ўхілу. Мелі месца яўна права-апартуністычныя настроі. У ячэйцы Белпэдтэхнікуму зусім слаба была разгорнута самакрытыка.

А. ШМУРЫЦКІ.

***

Паводле справаздачы бюро на чыстцы ячэйкі дэпо МВБ чыгункі (Менск) можна было меркаваць, што падрыхтоўчая работа праведзена добра. Але на справе тры разы праверачныя сходы зрываліся, бо ня толькі беспартыйныя, а нават і камуністы не зьяўліліся на сходы. Гэта выразна характарызуе стан партыйнай дысцыпліны ў ячэйцы і праведзеную масавую работу перад чысткай.

У першы дзень па чыстцы ячэйкі на сходзе прысутнічала 100 беспартыйных і каля 80 членаў і кандыдатаў партыі. Па справаздачнаму дакладу бюро ніхто з беспартыйных ня выказаўся, акрамя асобных партыйцаў. Калі-ж пачалася індывідуальная праверка, то актыўнасьць прысутных зусім зьменшылася. На сходзе прысутнічае ня больш 15-20 зацікаўленых жанчын і 20-25 членаў саюзу, якія літаральна ніякага ўдзелу ня прымаюць у праверцы. Бязумоўна, многія беспартыйныя рабочыя добра ведаюць недахопы таго ці іншага камуністага, але на чыстцы аб гэтым не гавораць. Толькі пасьля чысткі паміж сабой шушукаюцца па кутках.

Першыя чатыры дні чысткі паказалі, што ў ячэйцы дэпо ёсьць пэўныя недахопы. Палова партыйцаў мае партыйныя спагнаньні за п'янства, парушэньне партдысцыпліны і неэтычныя ўчынкі.

Многія члены ячэйкі не ўявілі сабе задач і прынцыпаў чысткі. Гэтыя партыйцы на праверачных сходах увесь час маўчаць, ня прымаючы ўдзелу ў праверцы. Яны, добра ведаючы аб недахопах партыйца, які праходзіць чыстку, не гавораць аб гэтым, бо, працуючы супольна з гэтым таварышом некалькі год, не жадаюць «псаваць» узаемаадносін. Напрыклад, т. **Клініцкі** пры праверцы партыйцаў, з якімі ён працуе, выступае толькі па станоўчых момантах. Пры праверцы т. **Гарачуна**, Клініцкі заявіў, што: «Гарачун зьяўляецца добрым партыйцам і таварышом». Між тым Гарачун мае суровую вымову з папярэджаньнем з боку партыйных органаў і адміністрацыйнае спагнаньне ў службовым парадку. Гэта на сутнасьці зьяўляецца кругавой парукай. Чыстка выкрывае сапраўдны твар некаторых камуністых.

Асобныя партыйцы на вытворчасьці плятуцца ў хвасьце, ня прымаюць удзелу ў сацспаборніцтве і г. д. Некаторыя партыйцы, як напрыклад, т. Гармаза, будучы ў вёсцы, не плаціў с.-г. падатку. Потым з іх прышлося спагнаць падатак пры дапамозе судовых органаў. Частка партыйцаў праяўляе антыпартыйныя і прымірэнчыя хістаньні (Гарачун, Багданаў). Трэба спадзявацца, што ў выніку чысткі рады ячэйкі будуць аздароўлены.

В. М.

Праверка ячэйкі хлебазаводу

6 дзён ішла чыстка і праверка партыйнай ячэйкі **хлебазаводу** (Менск). Спрэчкі па дакладу сакратара ячэйкі і індывідуальная праверка камуністых поўнасьцю выявілі ўсе хібы і дасягненьні ў рабоце ячэйкі. На заводзе разгорнута сацспаборніцтва. За час сацыялістычнага спаборніцтва выпуск прадукцыі павялічыўся звыш праграмы на 31 проц. Прадукцыйнасьць працы вырасла на 20 проц. Прагулы значна зьмен шыліся. Так, у кастрычніку ня было ні аднаго прагулу. Пасьля арганізацыі дзьвёх ударных брыгад завод абвясьціў сябе цалкам ударным. Многія рабочыя падалі заяву аб добраахвотным павялічэньні норм выпрацоўкі. Рабочыя-булачнікі патрабавалі павялічэньня норм на 20 проц. Бараначны цэх пасьля павялічэньня норм яшчэ дадаткова павысіў норму выпрацоўкі на 10 проц. Рабочыя ўдарнікі пастанавілі на працяру ўсёй яцыёдкі адлічваць у фонд індустрыялізацыі 1 проц. месячнага заработку. Хлебазавод абавязваецца ў далейшым зьняць прадукцыйнасьць працы на 25 проц. і палепшыць якасьць прадукцыі.

Але побач з гэтымі посьпехамі мелі месца значныя недахопы.

Пэфтаварыства заводу спаўзло з клясавых рэек. Асноўныя работнікі выканбюро шчыра агітавалі за тое, што ў падшэфнай вёсцы нельга арганізаваць калгас. Паводле іх думак у вёсцы кулак мацнейшы за беднату. Калі адзін кулак сказаў, што бядняк таму нічога ня мае, што ён гультай і п'яніца, тады член партыі **Каплан**, член выканбюро пэфтаварыства заводу, замест рашучага адпору кулацкай агітацыі, цалкам згадзіўся, што бядняк сапраўды «гультай і п'яніца».

Работа з насьцепгаэзэтай была ў заняпадзе. Члены рэдакцыйнай калегіі забавалі. Толькі зараз пасьля перавыбараў рэдакцыйнай калегіі, насьцепгаэзэта пачала выходзіць рэгулярна.

Дырэктыва аб падрыхтоўцы кадраў на заводзе зусім не ажыцьцяўляецца. Пастанова аб арганізацыі курсаў па перакваліфікацыі рабочых і работніц ня выканана.

Беларусізацыя ў ячэйцы не праведзена ў патрэбнай меры. Частка членаў партыі не выступае на беларускай мове.

Чыстка паказала, што камсамольская работа была ў заняпадзе. Партбюро слаба кіравала камсамольскай ячэйкай, што прывяло да роспуску бюро ячэйкі ЛКСМВ. Гэта бязумоўна зьяўляецца сур'ёзным недахопам. Наогул, бюро ячэйкі ў некаторых выпадках дапускала грубыя памылкі. Так, напрыклад, у вёску быў накіраваны камуністы **Абласко**, які скампрамэтаваў сябе, як члена партыі, сваімі антыпартыйнымі ўчынкамі. Таксама быў накіраваны для работы ў вёску **Плескач**, які дапусьціў на вытворчасьці рад агідных учынкаў. Многія таварышы, што выступалі ў спрэчках, адзначалі факты сямейнасьці, кругавой парукі, групоўшчыны, якія мелі месца ў ячэйцы.

Карціна яўнага разлажэньня была выяўлена пры праверцы камуністага **Любчанскага.** П'янства, лаянкі, сымуляцыя і г. д. былі звычайнай зьявай у жыцьці гэтага «партыйца». На вытворчасьці Любчанскі, як член партыі сябе не апраўдаў. Тыя таварышы, якія прабавалі выкрыць Любчанскага, сустракалі з яго боку супраціўленьне. Калі адна работніца, якая добра ведала Любчанскага, выступіла з выкрыцьцём яго паводзін у сямейным быце, Любчанскі імкнуўся дыскрэдытаваць гэту работніцу перад сходам. Ён заявіў, што работніца пазбаўлена права голасу. Праверком прымушаны быў пад адказнасьць Любчанскага выдаліць работніцу са сходу. На заўтра-ж высьветлілася, што работніца не пазбаўлена права голасу. Гэты факт выразна характарызуе сапраўдны твар Любчанскага.

На чыстцы высьветлілася, што партыец Кунцэвіч утаіў ад партыі тое, што ён зьяўляўся дэзэртырам.

Парт'ячэйка не заўсёды давала рашучы адпор рвацкім і хвасьцісцкім настроям.

Дырэктывы аб адзіначальнасьці не прапрацаваны і не папулярызаваны сярод рабочых мас. Нельга не адзначыць, што бюро парт'ячэйкі зьвярнула вялікую ўвагу на вылучэньне.

Ячэйка цесна ўвязала задачы чысткі з вярбоўкай у партыю перадавых рабочых, актыўных удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва. 20 рабочых падалі заявы аб прыняцьці ў КП(б)Б. 12 рабочых прынята ўжо ў партыю.

Самакрытыка ў асноўным была здаровая. Рабочыя-партыйцы выкрывалі памылкі і недахопы, ня гледзячы на асобы. Праверана 55 членаў і кандыдатаў партыі. Партспагнаньні накладзены на 10 партыйцаў. З гэтага ліку два партыйцы выключаны з партыі.

М. БЭРМАН.

****

Ударыць па нядбайнасьці

Праверка парткалектыву **камуністычнага унівэрсытэту** Беларусі імя Ў. І. Леніна скончана. Але праверком ня можа зрабіць канчатковых вываду ў адносінах да часткі партыйцаў з прычыны адсутнасьці патрэбных матар'ялаў. Ня гледзячы на тое, што праверком і бюро парткалектыву ня раз зьвярталіся да асобных раённых і акруговых парторганаў з просьбай прысылаць характарыстыкі і патрэбныя матар'ялы на даных партыйцаў—студэнтаў камуністычнага унівэрсытэту. Гэтыя матар'ялы яшчэ да гэтага часу ня прысланы. Напрыклад, праверком і бюро калектыву тры разы запрашвалі Полацкі раённы камітэт партыі аб прысылцы матар'ялаў на партыйца Войтанку М. П., які рапей працаваў у Полацкай раённай партарганізацыі. Аднак, **Полацкі** РК і па сёнешні дзень ня прыслаў матар'ялаў. Марудзяць з прысылкай матар'ялаў на тых ці іншых партыйцаў таксама і **Кармянскі РК** (Магілеўшчына), **Жлобінскі РК** (Бабруйшчына), **Капаткевіцкі РК** (Мазыршчына), **Мяжанскі РК** (Віцебшчына) і г. д.

Можна было-б яшчэ надаць рад прыкладаў, але і гэтыя прыклады выразна сьведчаць аб тым, што некаторыя партыйныя органы фармальна і нядбайна адносяцца да праверкі. Ня мабайна адносяцца да праверкі. Ня маючы патрэбных матар'ялаў, якія можа даслаць толькі даны партыйны орган, праверком ня можа канчаткова скончыць праверку партыйнага калектыву камуністычнага унівэрсытэту. АКК павінны рэагаваць на такія недапушчальныя адносіны вышэй адзначаных раённых органаў да такой важнай палітычнай справы, як праверка і чыстка членаў партыі.

ФАНДАРЭНКА.

Па СССР

Наркамзем СССР тав. Якаўлеў

аб задачах вясеньняй пасеўнай кампаніі

МАСКВА. 2-і на сходзе дырэктароў і агранамаў машына-будаўнічых станцый з дакладам аб задачах вясеньняе пасеўнае кампаніі 1930 году выступіў наркамзем СССР тав. Якаўлеў. «Да гэтага часу,—сказаў т. Якаўлеў,—вясеньнюю пасеўную кампанію мы праводзілі ў разьліку на павялічэньне пасеўнае плошчы індывідуальных сялянскіх гаспадарак. **Зараз-жа мы павінны атрымаць усю неабходную дзяржаве колькасьць хлеба ад калгасаў.**

У вясеньнюю пасеўную кампанію 1930 году мы разьлічваем павялічыць плошчу пасеваў на **11 проц, г. зн. на 10 млн. гэктараў.** Вясною зямельная плошча індывідуальных гаспадарак павінна зьменшыцца на 20 млн. гэктараў, а плошча пад калгасамі павінна быць павялічана на 30 млн. гэкт. Мы павінны таксама забясьпечыць рост ураджайнасьці на 8 проц. Выкананьня гэтых вялізарнейшых задач мы будзем дабівацца на аснове калектывізацыі. Калгасы вясною гэтага году павінны паказаць узоры дасканалай работы, а машына-трактарныя станцыі, якія абслугоўваюць вялікую колькасьць калектываў, павінны паказаць узор машынізаванай і мэханізаванай гаспадаркі».

Сібірскі камсамол рыхтуец ца да вясеньняй пасеўнай кампаніі

НОВАСІБІРСК. 31. Сібірскі камсамол усе свае лепшыя сілы мабілізае на падрыхтоўку вясеньняе пасеўнае кампаніі і калектывізацыі. 1-га студзеня распачынаецца абвешчаны рікомам КСМ «месячнік аўчысткі збожжа», для чаго створана 800 абозаў па аўчыстцы збожжа і больш 3.000 камсамольскіх брыгад. Камсамол узяў абавязацельства аўчысьціць 320 тыс. тон насеньня, у 4 разы больш чым у мінулым годзе і пратруціць палову ўсяго насеньня. Для рамонту інвэнтару райкомам паслана 200 брыгад. Камсамол паставіў задачу ў надыходзячую кампанію сваімі сіламі стварыць 104 калгасы (з пасеўнаю плошчаю ў кожным ня менш 5.000 гэкт.) і 2.500 прасьцейшыя аб'яднаньні.

АРГАНІЗАЦЫЯ РЫБАЦКІХ КАЛГАСАЎ

НІЖНІ-НОЎГАРАД. 1-і. За час катрычнік-студзень у краі арганізаваны 133 рыбацкія калгасы, якія аб'ядноўць 2.200 гаспадарак. Праводзіцца аграмаданьне рыбацкага інвэнтару. У 1930 годзе калгасы Камчаткова выціснуць в рынку прыватніка-гандляра рыбаю і дадуць рабочым раёнам 30.000 тон рыбы.

Суд над ксяндзом-распусьнікам

СІМФАРОПАЛЬ, 2. Пры вялізным натыпуе рабочых Сімфарополя і нямецкага сялянства вакольных вёсак пачаўся суд над каталіцкім ксяндзом сяла Розэнталь Грапам. Грап абвінавачваецца ў сыстематычнай анты-савецкай дзейнасьці—імкнуўся падрываць калектывізацыю нямецкае вёскі, пашыраў нелегальныя рэлігійныя лістоўкі, выкладаньні «закону божага», а таксама ў забойстве двух сваіх дзяцей-блізьнят.

Поўнасьцю сазнаўшыся на папярэднім следзьце ў гэтых злачынствах, Грап на працэсе прабуе зьмякчыць сваю віну і дае двухзначныя паказаньні. Шляхам перакрывавання допыту ўстанаўляецца, што ксёндз вёў власьлівую агітацыю супроць калгасаў. Усе яго паказаньні выкрываюць малюнак бруднага і распуснага жыцьця каталіцкага духавенства. Па заяве Грапа, пераважная большасьць ксяндзоў не захоўвае цэлібату (бясшлюбовасьць). Сам Грам укрыта распусьнічаў і прымушаў да сужыцьця жанчын, якія залежалі ад яго матар'яльна. Карыстаючыся рэлігійным уплывам, ён вымяньваў грошы і, урэшце, уцёк з Паволжжа, дзе вёў таксама антысавецкую работу, у Крым. Самавыкрыцьце і выкрыцьцё ксяндза Грапа зрабілі вялікае ўражаньне на прысутных на працэсе нямецкіх сялян. Многія, якія яшчэ верылі каталіцкай царкві і духавенству, нераканаліся ў іх контр-рэвалюцыйнай ролі і хлусьлівай «сьвятасьці».

Урачыстае спатканьне тав. Блюхэра ў Хабараўску

ХАБАРАЎСК, 1. У Хабараўск 31-га сьнежня прыехалі камандарм Блюхэр і нач. Пуарма тав. Донецка, якія былі на Забайкальскім фронце і асабіста кіравалі апэрацыямі супроць бела-кітайцаў у раёне Манчжурыі — Чжалайнор.

На вакзале ім было паладжана ўрачыстае спатканьне. У прамовах было адзначана, што правільная мірная палітыка савецкага ўраду знайшла найбольш вернае адлюстраваньне ў дзейнасьці Асобае арміі. Вымушаная даць адпор, яна правяла свае баявыя апэрацыі надзвычайна ўдала, абараняючы інтарэсы мірнага працоўнага насельніцтва.

Які эканамісты нам

Да дыспуту на праўгасе БДУ

Каго-ж рыхтаваць?

(У парадку абгаварэньня)

Да гэтага часу мы яшчэ ня маем пэўнага 5-гадовага пляну разьвіцьця эканамічнай асьветы ў БССР. Гэтым пытаньнем яшчэ стала не заняліся ні ВСНГ, ні НКА. Каго. **якога эканамістага, па якой галіне нам трэба рыхтаваць**—вось праблема, якая стаіць зараз перад эканамічным аддзяленьнем праўгасу БДУ і патрабуе хутчэйшага свайго вырашэньня.

Якія-ж нам патрэбны новыя кадры?

«Гэтыя кадры павінны ўладаць **даволі глыбокімі** спэцыяльна-тэхнічнымі і эканамічнымі ведамі, шырокім грамадзка-палітычным кругавідам і якасьцямі, патрэбнымі для арганізатараў вытворчай актыўнасьці шырокіх працоўных мас» — так адказвае на гэта пытаньне лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б).

Аднак, да гэтага часу ў нас больш спрачаюцца, хто нам патрэбен — «эканамісты-інжынэр», або «інжынэр-эканамісты». Справа ня ў назве, а ў тым, каб **кожны эканамісты знайшоў сваё месца ў вытворчасьці.**

Нам трэба рэарганізаваць прамысловы цыкль для падрыхтоўкі **эканамістых са спэцыяльнымі і тэхнічнымі ведамі,** каб апошнія добра ведалі тэхналёгічныя працэсы данай галіны прамысловасьці. Пытаньне, як рэарганізаваць — у асобны прамысловы **факультэт,** або ў прамысловае **аддзяленьне?** Гэтае пытаньне цесна зьвязана з ВТНУ, якая адкрываецца.

Наша думка (гэта думка і грамадзкіх арганізацый праўгасу), што нам **трэба рэарганізаваць прамысловы цыкль** (улічваючы сродкі, памяшканьне, наяўнасьць выкладчыкаў) **у прамысловае аддзяленьне праўгасу.**

Падрыгое, нельга згадзіцца з тым, каб спэцыялізацыю пачынаць толькі з 3-га курсу. Пры гэтых умовах ніяк нельга ён навінен аўладаць **цьвёрдай клясавай установкі.**

У мэтавай установцы трэба адмовіцца ад агульных фраз аб пырокім і вузкім тыпе эканамістага. Трэба ўзяць установку на **спэцыялізацыю эканамістых,** таму ў значнай ступені дапаможа бесперапынная вытворчая практыка. Апошняя павінна пачынацца з 1-га курсу займаць да 40 проц. усяго часу студэнтаў.

Пры ўмовах спэцыялізацыі і бесьперапыннай вытворчай практыкі з 1-га курсу можна скараціць тэрмін навучаньня да 3-х год, а на прамысловым аддзяленьні — да 3½ год, прычым ужо трэба сёлетні 3-ці курс выпусьціць за 3 гады, а 1-шы і 2-гі — за 3 гады, а гэта вымагае, каб ужо з 2-га сэмэстру гэтага навучальнага году мы пачалі працаваць па новых праграмах.

Зусім зразумела, што для якой-ся мы галіны не рыхтавалі эканамістаў, ён навінен аўладаць **цьвёрдай клясавай установкі.**

ЛУШЧЫЦКІ.

Гаспадарнікі яшчэ стаяць у баку

Да пытаньня аб падрыхтоўцы кадраў, патрэбных нашай прамысловасьці і савецкаму будаўніцтву, мы павінны падыходзіць пад кутом погляду тэмпаў і мэтадаў работы.

Аднак, нельга сказаць, каб нашы гаспадарнікі паказвалі студэнтам уважлівыя адносіны ў часе прахаджэньня імі бесьперапыннай вытворчай практыкі. Не заўсёды студэнту давалася магчымасьць поўнасьцю скарыстаць практыку для сваёй вучобы. Яшчэ да гэтага часу некаторыя гаспадарнікі разглядаюць студэнтаў-практыкантаў або як «прымусовых асартымэнт», або як танную рабочую сілу. З боку асобных таварышоў наглядаюцца проста такі **недапушчальныя адносіны** да пытаньня аб кантрактацыі студэнтаў. Такому дзяліцкаму падыходу да гэтага адказнага пытаньня трэба палажыць канец. Трэба добра даць па руках тых, хто ня хоча зразумець праграмы будаўніцтва сацыялізму. Калі радыкальна зьмяняецца ўся ўстаноўка нашых ВНУ, **трэба павялічыць ня толькі правы гаспадарчых органаў у справе падрыхтоўкі кадраў, але і наў у справе павялічыць іх адказнасьць.** Трэба, каб кіруючыя гаспадарчыя арганізацыі неад кладна заняліся пытаньнем аб падрыхтоўцы для іх неабходнага тыпу спэцыялістых.

Да сучаснага моманту маем такое становішча, што гэтым пытаньнем менш за ўсё займаюцца нашы гаспадарнікі. Можа ўсё займаюцца нашы гаспадарнікі. Можна прывесьці шмат прыкладаў нядаўнага мінулага.

У сучасны момант мы зноў стаімо перад неабходнасьцю перабудовы плянаў нашага факультэту.

Прававое аддзяленьне перабудавана поўнасьцю і з другога сэмэстру пераходзіць на новы тэмп і новы парадак работы. Гэта перабудова дала магчымасьць паскорыць выпуск і скараціць тэрмін навучаньня да трох год. З другога-ж сэмэстру на новым пляне пачынае працаваць і прамысловае аддзяленьне (былы прамысловы цыкль). Ставіцца пытаньне аб скарачэньні тэрмінаў навучаньня. Уносіцца рад зьмен і на іншых цыклях. Усё гэта патрабуе ад зацікаўленых органаў самага актыўнага ўдзелу ў жыцьці нашага факультэту і непасрэднай зацікаўленасьці яго работай.

Вось чаму мы лічым патрэбным у бліжэйшым будучым (5 студзеня г. г.) арганізаваць па закранутых вышэй пытаньнях спэцыяльны дыспут з шырокім удзелам кіруючых таварышоў-гаспадарнікаў, дзе з усёй адказнасьцю і выразнасьцю паставіць усе пытаньні, што датычыць праблемы падрыхтоўкі кадраў. Трэба, каб у гэтай справе дапамагалі нам партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі.

Н. КАНАПЛІН.

КУРЫНЫ СУД*)

У адзін а гарачых ліпнёвых дзён, калі вёска была пустая і па вуліцах яе вандравалі толькі малыя дзеці ды куры, у Якубаўцы адбылося здарэньне, надзвычайнае па таемнасьці і зьверству. Яшчэ і да гэтага часу якубаўцы не забыліся пра яго і цешаць сябе толькі тым, што нарсудзьдзя т. Каракулька, ня ў прыклад замежным самахвальцам-пінкэртонам, ня толькі растлумачыў жудаснае здарэньне, але выкрыў і ўзорна пакараў драпежніка-злачынцу.

Жудаснае здарэньне стала вядома якубаўцам толькі ўвечары, калі яны вярнуліся з поля. Пётра Васільлевіч Палявэчка—сталы дамавіты гаспадар—кінуўшы вокам па двары, раптам заўважыў, што сярод курынай чарады няма рабушкі, тэй самай, што недабачвала на адно вока. Палявэчка накіраваўся к сделу, спадзяючыся, што інвалідная рабушка ўжо ўселася на жэрдку пад павецьцю. Аднак, рабушкі там ня было. Яшчэ раз пералічыўшы курыны статак, Палявэчка заўважыў, што птушынная жывёліна неяк больш, чым звычайна, панадувалася і асалавела.

Дрэнная адзнака—падумаў Палявэчка і, прышоўшы ў хату, расказаў аб прапажы рабушкі жонцы, якая ў гэты час спрытна арудавала вілкамі і качаргою ў печы. Спачатку яна не дачула і падумала, што прапала рабушка-маці, вось тая, што вывела вясною васемнаццаць куранят. Калі-ж Палявэчка сказаў, што прапала рабушка-сьляпушка, бясплодная, Палявэчыха супакоілася і стала зноў мяшаць у печы. Але Пётра Палявэчка быў чалавек дамавіты, меў шмат ворагаў і ябеднікаў сярод якубаўцаў, якіх ён называў няйначай, як галышамі, дармаедамі, арыштантамі,—ён ня мог супакоіцца. Ён быў упэўнены, што прапажа рабушкі—гэта помста яму аднаго з гэтых галышоў, а іменна—суседа Аляксея Барысенка.

Паколькі Палявэчка думаў аб гэтых падазрэньнях голасна, то занепакоілася і Палявэчыха, задзірыўшыся з мужам наконт галышоў, пачала іх моцна клясьці і скардзілася на бога-заступніка, які ня бачыць іхняй крыўды.

Сонца ўжо зайшло, але летні вечар быў яшчэ празрыстым, і Палявэчка з жонкаю накіраваліся ў раён пастаянных прагулак рабушкі—на агарод Аляксея Барысенка. Хутка яны знайшлі ў траве зьмяты бяздыханны труп рабушкі, якая, прамучыўшыся ўсё жыцьцё з адным вокам, паранце, так трагічна зачыніла і другое. Палявэчыха хацела нават усхліпнуць, але ўспомніла, што рабушка доўга ня неслася і таму высмаркалася ў хвартух і сьціхла.

Аглядаеўшы добра месца, дзе супакоілася рабушка, Палявэчка заўважыў, што труп ляжыць якраз на мяжы бліжэй да яго, Палявэчкі, грады. Падсунуўшы незаметна нагою труп рабушкі на граду Аляксея Барысенка, Палявэчка падняў аскабалак, які валяўся тут, і палажыў яго побач з трупам на акрываўленую траву. Потым ён з нагрозаю вылаяўся і сказаў жонцы, што ня можа быць, каб ня было сьведак драпежніцкага ўчынку Барысенка.

Хутка жонка паведаміла Палявэчку, што шмат хто бачыў, як Барысенка, з калом у руках, перыў іхную бедную рабушку. Бачылі гэта: кум Васіль Крылоў, які чуў нейкі курыны лямант на агародах; бачыла Настася Машарская, сваячка на братняй радні, і Андрэй Самойлаў, што пазычыў сена вясною. Акрамя таго, Палявэчыха дадала, што Барысенка дачуўся аб забойстве рабушкі, насьміхаецца і кажа: знаць ня знаю і ведаць ня ведаю, і нават дома ня быў. Палявэчка ведаў цану гэтым кпінам свайго даўняга непрыяцеля Аляксея Барысенка і яшчэ больш разлаваўся на яго. На другі дзень, уяўшы ў хустачку дзесятак яек і паўбутэлькі першаку, Палявэчка накіраваўся да вясковага «аб лаката» і прасіў яго як можна ляпей расьпісаць злачынцу і бязбожніка Аляксея Барысенка. На трэці дзень чуць золак Пятро Палявэчка, маючы ў кішэні скаргу, ішоў у Расоны, дзе знаходзілася камэра нарсудзьдзі 4-га вучастка, Полацкай акругі, Каракулька.

Заяву прыняў сам судзьдзя Каракулька і, кінуўшы вачыма на Палявэчку, бегла прачытаў скаргу, чуць затрымаўшыся на словах: «...Барысенка, маючы на мяне нейкую злосьць, пастаянна робіць шкоду маёй гаспадарцы, калі ня сам, дык праз сваіх дзяцей і хатніх. Барысенка, узброіўшыся палкаю, забіў маю курыцу, якая каштуе мне зараз ня менш 2-х рублёў» (апошнія словы судзьдзя падкрэсьліў алоўкам) і далей ужо мэханічна чытаў: «А таму прашу нарсуд гр. Аляксея Барысенка пакараць па крымін. кодэксе за забойства маёй хатняй птушкі, коштам 2 р. і ўбытку 4 руб. (тут судзьдзя зноў падкрэсьліў), а ўсяго 6 (шэсьць) рублёў».

Нарсудзьдзя Каракулька, ня ў першы раз сустракаючы крывавую справу, захаваў на сваім твары чыста юрыдычны выраз і, цмокнуўшы асадкаю ў атрамант, прывычным гэстам махнуў на левым кутку скаргі: «пачаць крымінальную справу па 261 арт. КК (да 500 р. штрафу за псаваньне маемасьці!). Нарсудзьдзя 4 вучастку Каракулька».

Моцна стоячы на варце рэвалюцыйнай законнасьці, нарсудзьдзя Каракулька не дапускаў у сваёй працы ніякага фармалізму і таму не заўважыў невялікай недарэчнасьці: скарга датавана 14-м чэрвеня, а гаротная рабушка была забіта—паводле скаргі—10 ліпеня (спачатку стаяла 15 ліпеня), а сам нарсудзьдзя пад сваёй рэзалюцыяй паставіў: 1-е ліпеня. Нават дзень сьмерці не задачлівай рабушкі ня высьветліў, як належыць.

Прайшло лета і прышла больш спакойная восень. Якубаўцы пачалі ўжо забываць пра жудасную сьмерць Палявэчкавай рабушкі. Але вось у адзін кастрычніцкі дзён Барысенка сьведкі жудаснай справы атрымалі позвы ў суд. Справа слухалася ў м. Клясьцічах, куды прыехала выязная сэсія нарсуду 4 вуч. Расонскага раёну. Гэта было некаторай данінай раптоўна загінуўшай рабушцы. На суд зьявіліся усе: абвінавальнік, абвінавачаны і сьведкі, хоць па дарозе і палаяліся ў ахвоту. Пачаўся суд. Палявэчка паказваў, што Барысенка—забойца і прасіў прысудзіць у яго карысьць 6 руб.—два за рабушку і 4 руб. за страты ў будучым. Барысенка наадварот, казаў, што ён рабушкі не забіваў, а што труп яе падкінулі яму ў агарод. Сьведкі—Крылоў, Машарская і Самойлаў—паказалі, што Барысенка ня толькі забіў рабушку, але пасьмертна прыткнуў яе калом і дадавалі, што курыца была ня то, што ўжо вельмі, а так каштавала з рубля.

Нарсудзьдзя, як і заўсёды, сядзеў зусім спакойна, а сакратар сэсіі таксама спакойна запісваў паказаньні. Улічваючы іх, нарсудзьдзя Каракулька, як і заўсёды, спачатку «знайшоў», што кошт забітай рабушкі роўны рублю і прыбытковасьць ад яе за 40 штук яек, якія абавязкова зьнесла пакойная рабушка, лічачы па 6 кап. за яйцо 2 р. 40 кап. «Знайшоўшы,»—нарсудзьдзя прыгаварыў: «Барысенка Аляксея за зроблены ім злачынства падвергнуць меры сацыяльнай абароны прымусовым працам на пяць сутак... і спагнаць на карысьць Палявэчкі Пятруся 3 р. 40 к.».

Чытаў гэты незабываны прысуд нарсудзьдзя Каракулька сур'ёзна і ўрачыста, пачынаючы завучанай скарагаворкай: «Імем Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, народны суд» і г. д., а калі дайшоў да слова: «прыгаварыў», дык пачуў, што ў кутку хтосьці выразна хіхікнуў (кажуць, што гэта быў сам Палявэчка). Але трагічная сьмерць сьляпой рабушкі была ўшанавана, забойца пакараны, справядлівасьць і законнасьць перамаглі.

І ўсё гэта дзякуючы праворлівасьці Расонскага нарсудзьдзі 4-га вучастку т. Каракулькі.

Тыя, хто бываў у Расонах, расказвалі, што там зараз уся курыная грамада, з пашаны да свайго аборонцы, перасталі кудахтаць паранейшаму і пачалі крычаць пановаму:

— Ка-ка-ка-ра-куль-ка.

Разумныя птушкі гэтыя куры, чытач.

Р. Красьнеўскі.

Л. Кагановіч.

Праблема кадраў*)

Ставячы рашуча пытаньне аб падрыхтоўцы новых пралетарскіх спэцыялістых, мы тым самым не зьмяняем палітыкі партыі да старых спэцыялістых. Мы рашуча за скарыстаньне іх.

Бязумоўна, сярод старых спэцыялістых мы маем многа шкоднікаў. Аднак, статыстыка шкодніцтва паказвае, што ў ліку арыштаваных па шкодніцкіх справах у прамысловасьці — капіталістых і памешчыкаў—29 проц., іншых і «розначынцаў» — 70 проц., а ў ліку арыштаваных па транспарце дваран, патомственна-ганаровых грамадзян, купцоў і духавенства — 62 проц., і іншых — 37 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што шкодніцтвам ахоплены верхавінныя кадры спэцыялістых з былых уласьнікаў, акцыянэраў або, інакш кажучы, з камандных галоўкі капіталу. За гэтай варожай нам часткай спэцыялістых плыненца і частка «балота». Значная частка спэцыялістых прадстаўляе сабою «балота», і да нас, як-бы сказаць, адносіцца нэйтральна. Аднак, сярод спэцыялістых ёсьць і такія, якія канчаткова асымілаваліся ў нашым асяродзьдзі і добрасумленна ўдзельнічаюць у сацыялістычным будаўніцтве. Для характарыстыкі палітычнага твару варожай нам часткі прыводзім некалькі паказаньняў арыштаваных шкоднікаў. Вось што паказвае Пальчынскі:

«Я прызнаю, што мая палітычная пляцформа, дзейнасьць і выступленьне за час існаваньня савецкай улады былі

Забесьпячэньне лесарубаў прадуктамі яшчэ не наладжана

Камсамольцы арганізуюць ударныя брыгады

Прайшоў першы квартал лесазагатоўчай работы ў БССР.

Калі загатоўкі можна лічыць большменш здавальняючымі, то зусім дрэнна абстаіць справа з вывазкай загатоўленых матар'ялаў і дроў. Так, за першы квартал вывезена ня больш 4 проц. гадавой праграмы па леса-матар'ялах і 7 проц. па дрывах.

На першым месцы па загатоўцы лесаматар'ялаў ідзе Магілеўская акруга, якая выканала 118 проц. квартальнага пляну, і на апошнім месцы—Полацкая (67 проц.) і Віцебская (70 проц.). Іншыя акругі адстаюць.

Вывазка загатоўленых матар'ялаў і дроў накуль што не наладжана ні ў адной акрузе, за выключэньнем Гомельскай, якая выканала 58 проц. квартальнага заданьня па вывазцы. Месцы мала зварачаюць увагі на падрыхтоўку неабходнай гужавой сілы.

Усё яшчэ дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем рабочых-лесарубаў. Бел каапсаюз яшчэ да гэтага часу не разьмеркаваў прадуктаў, якія вызначаны для лесараспрацовак.

На мясцох да гэтага часу яшчэ няма цьвёрдых норм прадуктаў, якія павінны быць выданы лесарубам. Наркамгандаль ужо тры разы перарабляў гэтыя нормы, але да гэтага часу не пацікавіўся стварэньнем спэцыяльных фондаў гэтых прадуктаў. На мясцох у сувязі з гэтым наглядаецца вялікая неразьбярыха ў нормах.

У Полацкай акрузе спажывецкая каапэрацыя не выдае прадуктаў лесарубам, пакуль яны не ўнясуць пэўнага паю. Ёсьць выпадкі, калі тавары, накіраваныя спэцыяльна для лесарубаў, выкарыстоўваюцца на іншыя мэты.

Сацыялістычнае спаборніцтва да апошняга часу зусім ня было разгорнута паміж лесарубамі. Толькі зараз, у сувязі з мабілізацыяй камсамольцаў на лесазагатоўчы фронт, гэта работа паступова разгортваецца. Камсамольцы арганізуюць ударныя брыгады і зьяўляюцца прыкладам для іншых рабочых. Значна палепшылася культурнае абслугоўваньне рабочых-лесарубаў.

Ніякага ўдзелу ў лесазагатоўках ня прымаюць камітэты сялянскай узаемадапамогі. Наадварот, бываюць выпадкі, калі камітэты сялянскай узаемадапамогі прапануюць сялянам ня ісьці працаваць, пакуль не павялічаць расцэнак.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы

ДАБ'ЕМСЯ ЎДАРНЫХ, БАЯВЫХ ТЭМПАЎ

ВЯЛІКІ ПАХОД ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ АБАВЯЗВАЕ

зямельныя органы стаць штабамі сацыялістычнае рэканструкцыі вёскі

ГІСТАРЫЧНЫ ЭКЗАМЭН

(Ліст з Магілеўшчыны)

Для Магілеўшчыны, якая ў гэтым годзе павінна быць цалкам калектывізавана, надыходзячая веснавая сельска-гаспадарчая кампанія зьяўляецца гістарычным экзамэнам. Посьпехі яе правядзеньня, як ніколі, будуць залежаць ад таго, наколькі вакол чарговых задач калектывізацыі і ўсіх іншых масавых мерапрыемстваў па вёсцы будзе мабілізавана ўвага партыі, рабочае клясы, калгаснікаў і ўсяго гарадзкога і вясковага актыву. Посьпех сельска - гаспадарчай кампаніі будзе залежаць ад таго, наколькі поўна будуць мабілізаваны ўпутраныя сродкі акругі — кожнага калгасу, саўгасу і бядняцка - серадняцкага двара, наколькі старыя абломаўскія тэмпы і апаратныя мэтады работы будуць заменены новымі, ударнымі і адпавядаць творчаму энтузіязму рабоча-сялянскіх мас.

Надыходзячая сельска - гаспадарчая кампанія патрабуе асаблівай увагі да Магілеўшчыны і жывога кіраўніцтва з боку цэнтральных устаноў—Наркамзему і Белкалгассаюзу. Між тым, гэту ўвагу мы маем толькі на паперы. У акрузе не хапае 250 аграномаў, шмат каморнікаў і іншых спэцыялістых. Трэба цьвёрда і катэгарычна сказаць, што сучасныя тэмпы работы не адпавядаюць тым гістарычным задачам, якія стаяць перад Магілеўшчынай. Наркамзем, Белкалгассаюз, навукова - дасьледчыя ўстановы ня прымаюць належнага ўдзелу ў вырашэньні складанейшых задач па суцэльнай калектывізацыі акругі. Дагэтуль яшчэ не распрацаваны найбольш мэтазгодны тып буйнога калгасу. Ня вырашана справа з лясамі мясцовага значэньня, якія часта высякаюцца кулакамі.

Структура і зьмест работы раённага апарату павінны быць прыстасаваны да новых задач. Раённыя працаўнікі высоўваюць рад пытаньняў, якія патрабуюць свайго вырашэньня. Напрыклад, крэдытная сыстэма, па думцы некаторых, павінна быць аб'яднана ў адзіны раённы банк. Таксама пара прыступіць да арганізацыі райкалгассаюзаў і сеткі куставых аб'яднаньняў. Некаторыя прапануюць увесь агра-пэрсанал земорганаў, за выключэньнем некалькіх спэцыялістых, перадаць Калгассаюзу, кустом і непасрэдна калгасам - гігантам. Таксама і з лясамі мясцовага значэньня, якія неабходна было-б зараз-жа перадаць калгасам і іх кустом. Высоўваецца пытаньне аб рэарганізацыі акруговага зямельнага аддзелу. Апэрацыйныя функцыі больш мэтазгодна перадаць райвыканкомам і Калгассаюзу, за акруговымі органамі — пакінуць толькі кантроль, інспэкцыю і плянаваньне.

Для вырашэньня ўсіх гэтых неадкладных праблем было-б вельмі карысна, каб у Магілеве ў бліжэйшы-жа час была праведзена спэцыяльная нарада з удзелам прадстаўнікоў цэнтральных устаноў — Наркамзему, Белкалгассаюзу, НДІ і сельска - гаспадарчай акадэміі.

Азнаямленьне з ходам падрыхтоўчай работы паказвае на рад буйных недахопаў. У раёнах падрыхтоўка да веснавой сяўбы амаль зусім не разгорнута, раённыя пляны, пляны пасобных калгасаў яшчэ ня складзены. Акраз і акркалгассаюз ня ведаюць, як ідзе аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці ў арганізаваных і арганізуемых калгасах, ня ведаюць таксама, ці створаны насенныя фонды. Загатоўка жывёлы для калгасаў і саўгасаў пад пагрозай зрыву. Пакуль што адабрана для калгасаў 380 галоў, замест 4.500. Жывёлагадоўля яшчэ ня стала ў цэнтры ўвагі зямельных і савецкіх органаў.

Мабілізацыя ўпутраных рэсурсаў і стварэньне ў калгасах спэцыяльных фондаў на куплю машын, трактараў і ўгнаеньня праходзіць нездавальняюча. На 1-XII па акрузе яшчэ не спагнана звыш 167 тыс. па-затэрмінованых пазык.

Да падрыхтоўчай работы ня прыцягнуты шырокія масы саўгасаў, калгасаў, групы беднаты. У калгасах яшчэ не арганізаваны вытворчыя нарады, амаль зусім не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, яшчэ не распачата масавая вучоба калгаснікаў на курсах, спэцыяльных гурткох і г. д. Адстае і пралетарскі горад, яшчэ ня вылучаны рабочыя для сталай работы ў калгасах, не разгорнута масавае шэфства прадпрыемстваў над калгасамі. Праведзены нядаўна налёт па магілеўскія прадпрыемствы і ўстановы выявіў, што на збор попелу амаль ніхто не зварачае ўвагі, а той, які сабраны, ляжыць без усялякай карысьці і псуецца, ніхто яго не забірае.

Такое становішча з падрыхтоўкай да сяўбы на Магілеўшчыне зьяўляецца сыгналам як да цэнтральных устаноў, так і да ўсіх іншых акруг. Трэба абвясьціць бязьлітасную вайну старым земскім традыцыям і абломаўскім тэмпам работы.

Т. АЎЧЫНЬНІКАЎ.

1.500 студэнтаў і навуковых працаўнікоў абвясьцілі сябе мабілізаванымі

ВІЦЕБСК (наш кар.). Пры акрвыканкоме пад старшынствам намесьніка старшыні акрвыканкому тав. Пайкіна адбылася нарада прадстаўнікоў навуковых устаноў і студэнцкіх арганізацый, якая зьвярнулася з адозвай да ўсіх культурных сіл акругі ўзяць актыўны ўдзел у веснавой пасеўнай кампаніі.

31-га сьнежня ў Віцебску адбыўся шырокі агульна - гарадзкі сход студэнтаў і навуковых працаўнікоў, у якім брала ўдзел больш за 1.500 чал.

Сход абвясьціў сябе мабілізаваным і перадаў у распараджэньне штабу па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі і калектывізацыі вескі.

ДА ВЯСНЫ ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАЦЬ ЗВЫШ 2 МЛН. ГЭКТАРАЎ

НКЗ БССР распрацоўвае мерапрыемствы, накіраваныя да поўнага зямляўпарадкаваньня да веснавой сяўбы усіх існуючых калгасаў, а таксама і тых, якія будуць арганізаваны да сяўбы.

Перад зямляўпарадчымі працаўнікамі, такім чынам, ставіцца задача—зямляўпарадкаваць да вясны плошчу больш за 2 мільёны гэкт.

У прынцыпе вырашана ва ўсіх калгасах, за выключэньнем раёнаў суцэльнай калектывізацыі, правесьці зямляўпарадкаваньне ў самым спрошчаным парадку, в такім разьлікам, каб усе калгасы маглі прыступіць вясной да калектыўнай пахаці.

Спрошчанае зямляўпарадкаваньне зводзіцца ў асноўным да зямляпакаазаньняў, якія будуць давацца і ажыцьцяўляцца зямляўпарадчыкамі і сельсаветамі. Усякае зямляўпарадкаваньне індывідуальных гаспадарак спыняецца.

Ня гледзячы на тое, што ўся гэтая праца будзе весьціся цэлую зіму, таму штату зямляўпарадчыкаў, які ёсьць, ня справіцца з ёю. У сувязі з гэтым арганізаваны спэцыяльныя курсы зямляўпарадчыкаў пры Магілеўскім і Гомельскім с.-г. тэхнікумах. Гэтыя курсы дадуць яшчэ 160 працаўнікоў.

Да сучаснага моманту яшчэ не перададены ў НКЗ зямляўпарадчыкі, якія працуюць не па спэцыяльнасьці. Між тым, такіх зямляўпарадчых налічваецца па БССР згодна вестак НКЗ некалькі дзесяткаў.

Наладзіць збор адкідаў для адкорму жывёлы

Вельмі важнае значэньне мае зараз задача падрыхтоўкі мясных запасаў шляхам арганізацыі адкормачных пунктаў для буйной жывёлы і сьвіней. Многія арганізацыі пабудавалі ўжо адкормачныя пункты і паставілі жывёлу на адкорм. Але да гэтага часу яшчэ не ўрэгулявана пытаньне з кормамі для гэтай жывёлы. У якасьці кармоў выдаецца мука, каніна, хлеб і інш. каштоўныя кармы. Усе гэтыя дэфіцытныя кармы лёгка маглі-б быць заменены адкідамі, якія ёсьць у кожнай гаспадарцы. У кожным ЖАКЦ'е, у кожнай рабочай кватэры, сталоўках трэба арганізаваць збор адкідаў для адкорму жывёлы.

Шляхі пралетарскай літаратуры

На сходзе членаў БелАПП'у

Гэтымі днямі ў Доме пісьменьніка адбыўся сход членаў БелАПП'у, на якім з дакладам аб становішчы ВАПП'у і шляхох пралетарскае літаратуры выступіў прадстаўнік ВАПП'у т. **Селіваноўскі.**

У пачатку свайго дакладу т. Селіваноўскі адзначыў, што ў сувязі з новымі задачамі, якія паўсталі перад пралетарскай літаратурай, разгарнулася ажыўленая дыскусія вакол пытаньня літаратурнай мэтадалёгіі. ВАПП'у прышлося вытрымаць упартую і жорсткую барацьбу з так званай літаратуразнаўчай школкай праф. Переверзева, за сьпіной якое сталі і падтрымлівалі ўсім сваім аўтарытэтам некаторыя нашы тлустыя часопісі і рад літаратуразнаўчых навучальных устаноў.

Чаму ВАПП даў бой на гэтым вучастку? Таму, што тэорыя літаратуры, якую стварыў праф. Переверзеў, якая дагэтуль карысталася вялікім аўтарытэтам, пад прыкрыцьцём артадаксальнага марксызму, праводзіць рэвізію марксыцкага разуменьня мастацтва, правалакае меншавіцкія погляды на літаратуру. Псэўда-марксыцкая канцэпцыя Переверзева ёсьць адна з рознавіднасьцяй славутай тэорыі «мастацтва для мастацтва». Ва ўмовах абвастрэньня клясавае барацьбы гэта тэорыя ператвараецца ў зброю барацьбы супроць рэвалюцыйнага руху. Тав. Селіваноўскі падаў прыклад ацэнкі Переверзевым твораў Дастаеўскага, ацэнкі, якая зусім супрацьлеглая думцы т. Леніна.

Пакуль не ўмяшалася ў дыскусію «Праўда», ВАПП меў супроць сябе аб'яднаны фронт вучняў і прыхільнікаў праф. Переверзева, толькі пасьля выступленьня ЦО і шырокай партыйнай грамадзкасьці, школка Переверзева пачала адступленьне і, нарэшце, капітулявала.

Тав. Селіваноўскі ў сваім дакладзе падрабязна ахарактарызаваў задачы пралетарскай літаратуры ў пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі.

Пралетарская літаратура стаіць перад вялікімі іспытамі, перад экзамэнам — ці адпавядае яна запатрабаваньням гістарычнай эпохі карэннай перабудовы грамадзкіх адносін. Наша пралетарская літаратура адстае ад тэмпу жыцьця, у ёй няма гарэньня сёньняшнім днём сацыялістычнай будоўлі, рабочая кляса яшчэ не зьяўляецца арганічным, асноўным гэроем яе тэматыкі. Пралетарскай літаратуры трэба перабудавацца на гэтыя тэмпы, перабудаваць тэматыку, прасякнуцца патасам сацыялістычнага будаўніцтва.

У заключэньне т. Селіваноўскі падкрэсьліў, што перад арганізацыямі пралетарскіх пісьменьнікаў стаіць задача—вылучыць пісьменьнікаў з рабочага асяроддзя, ставіць [illegible]

ПЛЯНЫ ЗАГАТОВОК НАСЕНЬНЯ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

Майстэрні для рамонту трактараў і складаных машын не арганізаваны

Дырэктар Белсельгаснабу тав. Талапіла ў гутарцы з нашым супрацоўнікам паведаміў аб пэрспэктывах забесьпячэньня БССР с.-г. машынамі, насеньнем і штучным угнаеньнем.

У БССР у гэтым годзе завезена розных машын акрамя трактараў і прычэпных машын на суму ў 9.934.000 рублёў, што ў адносінах да плянавых меркаваньняў складае 94,3 процантаў, а ў параўнаньні з 1928-29 годам дае павялічэньне на 116 проц.

Плянавыя патрабаваньні БССР па мэханічным складаным інвэнтары задавальняюцца ўсяго ў разьмеры 17,8 процантаў.

Ня гледзячы на буйныя дасягненьні ў вырабе с.-г. машын, прамысловасьць усё-ж адстае ад тэмпу рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Асабліва адстае ў вырабе складаных машын беларуская прамысловасьць. Гэта пагражае самой прамысловасьці, бо яна можа застацца без спажыўца на сваю прадукцыю.

У першым квартале 1929-30 году адзначаецца значны недагруз некаторых відаў машын і прыклад, асабліва складаных машын і запасных частак.

Надта дрэнная становішча з забесьпячэньнем с.-г. машын і прылад рамонтам, а машынакарыстальнікаў тэхнічнай дапамогай. Ня гледзячы на рад пастаноў ураду і эканомнарады, ВСНГБ і іншыя арганізацыі дагэтуль не арганізавалі спэцыяльных майстэрань для рамонту складаных с.-г. машын-трактараў і інш. Таксама не наладжана пармальнае забесьпячэньне машынакарыстальнікаў гаручым і змазачным матар'ялам. Няма належнай колькасьці запасных частак да складаных машын. Амаль што зусім адсутнічае тэхнічнае інструктаваньне машынакарыстальнікаў з боку арганізацый, у распараджэньні якіх знаходзяцца трактарныя гаспадаркі.

Існуючыя рамонтныя майстэрні дрэнна абсталяваны і не забясьпечаны матэрыялямі. Запатрабаваньне Беларусі ў матэрыялах для рамонту машын задаволена толькі ў разьмеры 40 проц. У выніку гэтага складаныя машыны скарыстоўваюцца нерэнтабэльна.

Белсельгаснаб уваходзіць ва ўрадовыя органы з дакладной запіскай аб правядзеньні раду важных мерапрыемстваў у гэтай галіне. Белсельгаснаб прапануе арганізаваць 24 майстэрні па рамонце трактараў і іншых машын. З замежаў ужо выпісана абсталяваньне для 16 майстэрань. Кожны трактар будзе прымацаваны для поўнай майстэрні. Тэхнічная дапамога будзе так сканцэнтравана, каб трактаракарыстальнікі змаглі-б атрымаць гэтую дапамогу на радыусе ня больш 50-60 кілёмэтраў.

* * *

Загатоўка насеньня па БССР праходзіць нездавальняюча. С.-г. каапэрацыя і спажывецкая каапэрацыя выканалі плян загатовак па каноплях — 12 проц., віка—15 проц., сарадэля—2 проц., лубін—½ проц., ільна-семя—50 проц., цімафэйка—9 проц. Гэта становішча трэба прызнаць пагражаючым. Пляны загатовак і забесьпячэньне насеньня пад пагрозай зрыву.

У адносінах штучных угнаеньняў намячаецца завоз у 1929-30 годзе супэрфасфату—32.500 тон, фасфарытнай мукі —45.000 тон, касьцяной мукі—4.500 тон, калійнай солі—5.100 тон і інш., што дае павялічэньне супроць завозу мінулага году на 100 проц. Аднак, плянавыя патрабаваньні ў штучных угнаеньнях задаволены ўсяго па 32 проц. Тлумачыцца гэта тым, што прамысловасьць у вырабе штучных угнаеньняў адстае ад запатрабаваньняў сельскай гаспадаркі.

Такое становішча абавязкова каапэрацыйную і сазецкую грамадзкасьць, заморганы зьвярнуць больш увагі збору попелу, які часткова замяняе калійныя ўгнаеньні.

М. К.

Плешчаніцкі раён—раён суцэльнай калектывізацыі

У «Зьвязьдзе» паведамлялася ўжо, што Плешчаніцкі раён яшчэ ня так даўно плёўся ў хвасьце калектывізацыі. Тэмпы работы былі вельмі нездавальняючыя. Але за апошні час у раёне наглядаецца пералом, зроблены значны зрух у галіне разгортваньня калектывізацыі. Так апошні пленум Плешчаніцкага райкому партыі, які адбыўся 29-га сьнежня, пастанавіў лічыць Плешчаніцкі раён раёнам суцэльнай калектывізацыі.

На сёньняшні дзень у раёне ёсьць 22 калгасы, якія займаюць 26 проц. сенапахаці раёну. Калгасы аб'яднаюць 19,5 процантаў гаспадарак усяго раёну. Горнаўскі і Ўзбіцкі сельсаветы цалкам калектывізаваны.

Запольскі і Крайскі сельсаветы калектывізаваны на 20 проц.

Харкаўскі альбумінавы завод выпускае дрэнную прадукцыю

Павялічэньне экспарту набывае вялікае значэньне, як фактар, які спрыяе хутчэйшаму ажыцьцяўленьню пяцігадовага пляну ў рэканструкцыйны пэрыяд.

Таму рабочы калектыў фанэрнай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» прымае ўсе меры да таго, каб павялічыць удзельную вагу ф-кі ў экспарце на 1929-30 год. Уся энэргія рабочых накіравана на тое, каб павялічыць выпуск прадукцыі, зьменшыць брак і зьнізіць сабекошт прадукцыі.

Аднак, у практычнай рабоце ёсьць факты, калі заводы, якія забясьпечваюць ф-ку клеем, выпускаюць нядобраякасную прадукцыю і тым самым перашкаджаюць ажыцьцявіць намечаныя пляны.

Так, напрыклад, 20-га лістапада г. г. прыбыла партыя альбуміну, вагою ў 6.465 кілёграм ад харкаўскага альбумінавага заводу. Гэты альбумін вельмі дрэннай якасьці, кепска рашчыняецца, мае шмат асадкаў і дае 50 проц. браку. Усё пацьвердзілася тым, што замест нармальнага выдатканьня да 10 кілёграм на 1 куб. мэтр, выдаткавана 20 кілёграм. Акрамя таго ф-ка мела вялікія страты ад дрэннай якасьці клею, экспартная фанэра пэрайшла з першага гатунку ў брак.

Такое зьявішча прымусіла рабочых і служачых абгаварыць пытаньне на вытворчай нарадзе, дзе і выявілася, што з боку рабочых харкаўскага заводу ёсьць дрэнныя адносіны да выпуску прадукцыі.

Рабочыя фанэрнай ф-кі «Чырвоны Кастрычнік» завастраюць пытаньне на дрэннай якасьці прадукцыі перад заводзкімі кіраўнічнымі арганізацыямі і рабочымі харкаўскага заводу, каб хутчэй ліквідаваць усе паказаныя недахопы ў іх рабоце.

Адначасова рабочыя патрабуюць выявіць вінаватых у адпраўцы нядобраякасных матар'ялаў і прыцягнуць іх да адказнасьці.

П—н.

З зьнішчэньнем сабекошту дрэнна

Завод «Чырвоная Зорка»

Па пляне ў 1929-30 годзе дражджавы завод «Чырвоная Зорка» павінен зрабіць 2.750 тон дрожджаў. У кастрычніку і лістападзе завод павінен быў выпусьціць 500 тон дрожджаў. Фактычна-ж выраблена: у кастрычніку — 200,9 тон, або 80,8% пляну і ў лістападзе — 184,7 тоны, або 74% пляну.

Выхад дрожджаў з адзінкі сыр[illegible] вызначаны па пляне 71,7%, фактыч[illegible] на-ж мы маем: у кастрычніку 65,7% і ў лістападзе — 65,9%.

Адзін рабочы, паводле праграмы павінен быў зрабіць 65 кілёграм дзень. Фактычна-ж у кастрычніку [illegible] рабочага прыпадае 59,6 кілёграм (91%), а ў лістападзе — 62,35 кілёграма (96%).

Са зьніжэньнем сабекошту справ[illegible] таксама абстаіць дрэнна. Па пляне вызначана зьнізіць сабекошт да 32,1 кап. за кілёграм. Фактычна-ж сабекошт у кастрычніку складаў 33,7 кап. за кілёграм. У лістападзе лічо[illegible] сабекошту не зьмянілася.

Пры гэтым трэба адзначыць, што зарплата, ня гледзячы на зьмяншэньне прадукцыйнасьці працы, усё-ж та[illegible] ўзрасла ў параўнаньні з вызначана[illegible] на пляне ў кастрычніку на 3,6% і лістападзе на 14,7%.

С.

Перавыбары КСУ праходзяць нездавальняюча

(АРШАНСКАЯ АКРУГА)

Ня гледзячы на рад дырэктыў цэнтральных партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый, а таксама Аршанскага акругкому КП(б)Б, — арганізацыі Аршаншчыны ня ўжылі рашучых мер, каб падрыхтавацца да перавыбараў камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі, каб шырока разгарнуць гэту кампанію.

Вакол перавыбараў КСУ ня была створана адпаведная грамадзкая думка. Акруговая і раённыя камісіі па перавыбарах арганізаваны з вялікім спазьненьнем: акруговая камісія створана 24-га лістапада. Дрыбінская раённая — толькі 1-га сьнежня, сельскія камісіі па Дрыбінскім раёне — 5-8 сьнежня; Талачынская раённая камісія пачала працаваць толькі 14-га сьнежня, першае пасяджэньне Круглянскай камісіі адбылося 14-га сьнежня. Між тым, прэзыдыум ЦК КСУ даў пэўны тэрмін арганізаваць камісіі да 20-га лістапада.

Акруговая выбарчая камісія за ўвесь час работы — за пэрыяд больш месяца — сабралася толькі адзін раз. Ня было з яе боку цьвёрдага штодзеннага кіраўніцтва перавыбарчай кампаніяй.

Амаль нічога не зрабілі прафэсыянальныя арганізацыі, калі ня лічыць пасылкі некалькі дзён назад 5-ці брыгад на вёску. Толькі нядаўна саюзы разаслалі ў раёны адпаведныя дырэктыўныя лісты; прафарганізацыі ня ведаюць, які ўдзел прымаюць іх мясцовыя органы, члены саюзу ў перавыбарчай кампаніі. Нарада старшынь аршанскіх акраддзяленьняў саюзаў яшчэ 22-га сьнежня канстатавала, што саюзы прымаюць вельмі слабы ўдзел у перавыбарах КСУ.

Слабы ўдзел прымае ў перавыбарах і акруговы камітэт ЛКСМБ. Ён ня ведае, што робіцца на мясцох, якую актыўнасьць праяўляюць у перавыбарах раённыя і вясковыя камсамольскія арганізацыі.

Слабая ўвага з боку акруговых арганізацый награжае пасьпяховаму правядзеньню кампаніі на мясцох. З-за непадрыхтаванасьці да кампаніі перавыбары КСУ па Багушэўскім раёне адтэрмінаваны да 1-га студзеня. Дубровенская выбарчая камісія не прапрацавала інструкцыі аб перавыбарах і парушыла нормы выбараў.

У Дрыбінскім раёне (па 6-ці сельскіх камітэтах) з 148 выбраных упоўнаважаных толькі 5 батракоў, у Горацкім раёне на 64 выбарчых вучастках прысутнічала толькі 38 проц. выбарчыкаў, з іх жанчын — толькі 10 проц.

Дубровенская раённая выбарчая камісія склікалася 4 разы, але з-за няўкі членаў пасяджэньне ніяк не магло адбыцца. Да ўдзелу ў перавыбарах зусім ня былі прыцягнуты рабочыя фабрыкі «Дняпроўская мануфактура». Кампанія ня была зьвязана з мерапрыемствамі па правядзеньні калектывізацыі. На сходах ня была разгорнута шырокая крытыка дзейнасьці сельскіх камітэтаў, не на ўсіх выбарчых сходах рабіліся справаздачы рэвізійных камісій.

Трэба адзначыць, што перавыбары КСУ праходзяць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы.

У вёсцы Якубава, Будайскага сельсавету кулак-бантысты Шастакоў імкнуўся сарваць агульны сход і высоўваў кандыдатуры кулацкіх падпявал. Але бантысты-кулак сустракаў належны адпор з боку беднаты. Рад выпадкаў кулацкіх вылазак зарэгістраваны ў Расьпянскім раёне. У в. Тышчы на выбарчы сход зьявілася шмат кулакоў і пазбаўленых і ў зьвязку з гэтым прышлося сход адкласьці. У в. Віскліна кулацтва перад агульным сходам абмяркоўвала кандыдатуры ў новы склад КСУ. У вёсцы Грабалава ў часе перавыбарчага сходу кулакі паламалі арфу, якая належала камітэту сялянскае ўзаемадапамогі. Усе выступленьні варожых элемэнтаў сустрэлі жорсткі адпор з боку батрацтва, беднаты і калгаснікаў. Наогул, у Расьпянскім раёне падрыхтоўка да перавыбараў была праведзена значна лепш, чым у іншых раёнах.

Акруговая выбарчая камісія зараз прыняла рашучыя меры, каб разгарнуць кампанію перавыбараў, каб мабілізаваць вакол яе ўвагу шырокай савецкай грамадзкасьці.

Ар. РАЙ.

У нас-жа мовы не вывучаюць, моладзь не зварачае на гэта ўвагі.

* * *

Праблема кадраў ня ёсьць праблема апаратна-адміністрацыйная. Завастрэньне гэтай праблемы ў цяперашні пэрыяд зьвязана з усёй палітыкай нашай партыі наступленьня на капіталістычныя элемэнты, з максымальна шыракім тэмпам, з якім мы ідзем па шляху выкарчоўваньня карэньняў капіталізму. Бо ў галіне культуры, у галіне кадраў карэньні капіталізму асабліва моцныя, бо ў мінулым тэхнічныя веды былі манаполіяй заможных клясаў.

Сама на сабе праблема кадраў ёсьць праблема арганізацыйная. Але для нас марксыстых-ленінпаў няма арганізацыйнай праблемы па-за палітыкай. Мы заўсёды ўвязваем пашу арганізацыйную работу, нашы арганізацыйныя формы і арганізацыйныя задачы з асноўнай палітычнай лініяй, з лініяй клясавай барацьбы за сацыялізм, за камунізм. І калі прасачыць усю гісторыю нашай бальшавіцкай партыі, то мы ўбачым, што на розных этапах, прыстасоўна да розных арганізацый, увага да праблемы кадраў была заўсёды адпаначальнай рысай бальшавізму. Вязумоўна, усякая гістарычная аналёгія адносная. Калі ўзяць праблему прафэсыянальных рэвалюцыянэраў, якую Ленін завастрыў супроць меншавікоў у першым пэрыядзе будаўніцтва нашай партыі, то ўбачым, што Ленін зьвязваў задачу падрыхтоўкі прафэсыянальных рэвалюцыянэраў, арганізатараў і будаўнікоў нашай партыі, нытрыманых, стойкіх бальшавікоў, паступовай падрыхтоўкі рабочых з асноўнымі задачамі, з задачамі сапраўдцай,—а ня мнімай, ня слоўнай—рэвалюцыйнай барацьбы. Калі ўзяць іншы пераломны пэрыяд у гісторыі нашай партыі — перадкастрычніцкія дні,—вядомае, што адным з самых сур'ёзных, адным з рашаючых довадаў супроць меншавікоў, «поважызьненцаў» і паўменшавікоў у нашых уласных радох, ка заўшых аб тым, што рабочая кляса ня справіцца з задачай кіраўніцтва дзяржаваю, быў довад Леніна, што саветы даюць нам новыя кадры мільёнаў будаўнікоў новае савецкае дзяржавы. І тут праблему кадраў Ленін увязваў з сваёй асноўнай палітычнай установкай на праблеме кадраў для народнай гаспадаркі і, у першую чаргу, для прамысловасьці вынікае з нашай генэральнай палітычнай лініі. Яно вынікае з пастаўленай партыяй задачы хуткага тэмпу індустрыялізацыі краіны, хуткага тэмпу сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, з правільнага разуменьня клясавых суадносін сіл і працэсаў абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне.

І невыпадкова, што кіраўнікі правых ухілістых, не разумеючы гэтай генэральнай лініі, супроцьпастаўлялі ёй сваю палітыку, палітыку чарапашынага тэмпу, палітыку замазваньня клясавай барацьбы, што гэтыя таварышы не разумеюць вострасьці праблемы кадраў, замазваюць яе, прабуючы прыкрыць гэту сваю правую пазыцыю зусім бясспрэчнымі ісьцінамі аб неабходнасьці скарыстаньня старых спэцыялістых, таксама, як яны прабуюць прыкрыць свае пярэчаньні супроць калгасаў, супроць наступленьня кулака спасылкамі на саюз з серадняком.

Калі тав. Рыкаў адкрыта і проста выступаў супроць хуткага тэмпу падрыхтоўкі новых кадраў, то тав. Бухарын, згаджаючыся з задачай падрыхтоўкі новых кадраў, ставіць яе пасвойму, г. зн. не паленінску. Мы маем на ўвазе тэзіс тав. Бухарына да пленуму ВСНГ «Аб рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьці і НТУ».

У гэтых тэзісах тав. Бухарын дапусьціў рад памылак у пастаноўцы пытаньня аб задачах навукова-дасьледчай работы, аб рэарганізацыі прамысловасьці і падрыхтоўкі кадраў. Даволі паказаць на тое, што тав. Бухарын ва ўсіх сваіх тэзісах аб кадрах і навукова-дасьледчай рабоце нічога не сказаў аб тым абвастрэньні клясавай барацьбы, якое мы маем у краіне, і клясавай дыфэрэнцыяцыі сярод вучоных. Кажучы аб поўных кадрах, тав. Бухарын нічога не сказаў аб шкодніцтве сярод кадраў спэцыялістых, не паказаў на необходнасьць побач са скарыстаньнем старых спэцыялістых, клясавай дыфэрэнцыяцыі сярод іх, ідэалёгічнага наступленьня. Тав. Бухарын, між іншым, увесь час ужывае тэрміналёгію «савецкіх спэцыялістых». Але ён ня можа ня ведаць, што нас гэта зараз не здавальняе, што пытаньне ідзе зараз ня проста аб «савецкіх», а аб старых, пралетарскіх кадрах, [illegible] мі. Мы ўжо ня кажам аб памылках у агульным аналізе сучаснага пэрыяду сацыялістычнай рэвалюцыі, дзе тав. Бухарын заяўляе аб тым, што «рэканструкцыйны пэрыяд гэта ёсьць фазіс хутчэйшай рэвалюцыі, які перажывае сацыяльная рэвалюцыя, што адбываецца пры ломцы старых адносін». Гэта і ёсьць, між іншым, адзін з карэньняў памылак тав. Бухарына, калі ён сучасны пэрыяд разглядае ня з пункту погляду сацыяльна-клясавага, а з пункту погляду тэхнічнага(і пытаньне аб кадрах стаіць з пункту погляду тэхнічнага, у той час, як перад намі стаіць задача ня проста тэхнічнай рэканструкцыі, а карэннай ломкі ўсіх сацыяльна-эканамічных адносін, побач з тэхнічнай рэвалюцыяй, а не наадварот. **І ў пытаньні аб кадрах перад намі стаіць задача ня проста колькаснага павялічэньня кадраў, а перад намі стаіць сацыяльна-клясавая задача падрыхтаваць верныя сацыялізму, які будуецца, кадры будаўнікоў і кіраўнікоў.**

Мы ўступілі ў рашаючы пэрыяд сацыялістычнай рэвалюцыі, у пэрыяд жорсткай барацьбы паміж капіталістычнымі элемэнтаў з растучымі сацыялістычнымі, партыя праводзіць цьвёрдую ленінскую палітыку хуткага, гіганцкага размаху будаўніцтва сацыялізму, мы павінны ў нашых арганізацыйных задачах пасьпяваць за хуткага ідучымі працэсамі росту ў краіне, арганізацыйна замацоўваць правільную ленінскую палітыку. Партыя дала рашучы адпор правым ухілістым. Партыя з посьпехам вырашае важнейшыя праблемы палітыкі, праблемы індустрыялізацыі, праблемы росту цяжкай індустрыі, абожжавую праблему, а зараз мы павінны вырашыць праблему кадраў, праблема кадраў чакае яшчэ свайго вырашэньня. **«А праблема кадраў зьяўляецца зараз, у абставінах тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасьці, рашаючай праблемай сацыялістычнага будаўніцтва».** (Сталін).

Партыя павінна здолець і здолее правільную ленінскую палітыку паленінску замацаваць арганізацыйна стварэньнем [illegible]

Усебеларуская культнарада

Бюракраты зрываюць ліквідацыю няпісьменнасьці

Баявая задача прафсаюзаў—уцягнуць шырокія рабочыя масы ў барацьбу за найхутчэйшую ліквідацыю няпісьменнасьці

Другі і апошні дзень Усебеларускай культнарады быў прысьвечаны двум пытаньням: ліквідацыі няпісьменнасьці і рабоце з прафактывам.

Па першым пытаньні быў заслуханы даклад загадчыка культаддзелу ЦСПСБ тав. **Клімковіча.** З дакладу і спрэчак высьветлілася, што са справай ліквідацыі няпісьменнасьці ва многіх мясцох абстаіць зусім дрэнна.

Згодна кантрольных лічбаў, трэба ахапіць у гэтым годзе звыш 250 тысяч чалавек няпісьменных і малапісьменных (больш, чым у мінулым годзе на 163 тыс. чалав.). Гэты вялікі наход за пісьменнасьць павінен быў выклікаць ня менш энтузіязм з боку устаноў і арганізацый, якім гэта справа даручана. У першую чаргу павінны былі мабілізаваць усе сілы і сродкі нашы прафсаюзы. Але як высьветлілася на культнарадзе, у рабоце прафсаюзаў, як і ў рабоце асьветных устаноў, столькі недахопаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці, што выкананьне кантрольных лічбаў—пад лагрозай зрыву.

Да гэтага часу няма дасканалага ўліку ахопу няпісьменных школамі ліквбезу. Вучот наладжаны толькі па 54-х раёнах. Па вестках з гэтых раёнаў ахоплена школамі ліквбезу каля 124 тыс. чалавек. Улічваючы, што раёнаў усяго па Беларусі 101, трэба зрабіць вывад, што **контрольная лічба яшчэ не дасягнута.**

Асаблівую небясьпеку выклікае **ліквідацыя няпісьменнасьці сярод батрацтва.** Згодна ўмовы ЦП саюзу сельгаслесрабочых з Наркамасьветы, апошні павінен уцягнуць у школы ліквбезу 50 т

Новыя нормы водпуску хлеба

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ

Прэзыдыум ЦСПСБ, па дакладу Наркамгандлю аб павялічэньні норм водпуску хлеба рабочым і служачым, згадзіўся з прапановай Наркамгандлю аб наступных нормах:

рабочыя фізычнай **працы атрымоўваюць дадаткова па 100 грам хлеба штодзенна;**

сем'і рабочых, служачыя і іх сем'і атрымоўваюць дадаткова па 1/2 кілё пшанічнай мукі на едака ў месяц;

дзеці рабочых і служачых да 10-гадовага ўзросту атрымоўваюць штомесячна дадаткова па 1 кілё пшанічнай мукі.

Новая форма барацьбы за якасьць прадукцыі

Пачынаньне камсамольцаў заводу „Дрэваапрацоўшчык"

Рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» перайшлі на новыя тэмпы работы, вядуць барацьбу за зьніжэньне сабекошту, за паляпшэньне якасьці прадукцыі. Але рабочыя лічаць, што цяжка дасягнуць посьпехаў у паляпшэньні якасьці бяз удзелу самога спажыўца.

Часта рабочыя і адміністрацыя нават ня ведаюць, якія недахопы мае прадукцыя данага заводу.

Камсамольскі калектыў заводу «Дрэваапрацоўшчык», у мэтах паляпшэньня якасьці прадукцыі, парашыў арганізаваць вечар сустрэчы рабочых заводу і тэхпэрсаналу са спажыўцом заводзкай прадукцыі, пачынаючы ад дзяржпрадпрыемстваў і канчаючы асобнымі грамадзянамі.

Спажыўцы павінны прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні вечару і сказаць сваё слова аб недахопах прадукцыі дрэваапрацоўчай прамысловасьці.

Вечар будзе праведзены ў першай палове лютага.

Камсамольскі калектыў заклікае спажыўцоў прадукцыі заводу даваць матар'ял аб якасьці яе, зьмяшчаць гэты матар'ял на старонках друку. Акрамя таго, вельмі пажадана, каб спажыўцы, якія жадаюць прыняць удзел у вечары, зараз-жа зарэгістраваліся ў заводзкім на мітэце «Дрэваапрацоўшчыка».

Калектыў ЛКСМБ заводу «Дрэваапрацоўшчык».

Што пастанавіла ўсебеларуская нарада па фізкультуры

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намесьнік старшыні БСФКБ т. Леў падзяліўся вынікамі ўсебеларускай нарады працаўнікоў фізкультуры.

— Усяго ў нарадзе прымала ўдзел 60 чал. (сумесна з прадстаўнікамі прафарганізацыі). Асноўнае пытаньне, якому нарада ўдзяліла найбольшую ўвагу —было пытаньне аб **задачах фізкультурнага руху ў Беларусі ў сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б).**

ЦК УсеКП(б) прызнаў стан фізкультурнай працы нездавальняючым, слаба ахоплены фізкультурай шырокія рабочыя масы, фізкультурнікі прымаюць слабы ўдзел у агульных грамадзка-палітычных кампаніях, ёсьць наяўнасьць чампіёнства і г. д.

Асноўныя мерапрыемствы, намечаныя нарадай, наступныя: **падняць палітычную актыўнасьць фізкультурнікаў і накіраваць гэту актыўнасьць у бок усямернага ўдзелу ва ўсіх палітычных, гаспадарчых і культурных мерапрыемствах** (выбары ў саветы, барацьба з няпісьменнасьцю, садзейнасьць рэалізацыі і г. д.).

Перад вытворчымі гурткамі фізкультуры пастаўлена задача **прымаць шырокі ўдзел у жыцьці прадпрыемства. Вясковыя гурткі фізкультуры павінны стаць ударнымі брыгадамі ў галіне выкананьня задач рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.** Фізкультурнікі вёскі да веснавой пасеўнай кампаніі павінны ачысьціць 160.000 пудоў насеньня.

Усе гэтыя задачы могуць быць выкананы толькі тады, калі **фізкультурныя гурткі будуць ачышчаны ад сацыяльна-чужых нам элемэнтаў,** пры рашучай барацьбе з чэмпіёнствам і іншымі хваравітымі зьявішчамі, пры шырока разгорнутай самакрытыцы.

Нарада зацьвердзіла наступныя кантрольныя лічбы, якія павінны быць выкананы да 1-га верасьня 1930 году: **павялічыць колькасьць рабочых у фізкультурных гурткох на 50 проц., ахапіць гімнастыкай 30 проц. рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў, арганізаваць фізкультурныя гурткі ў 50 процантаў усіх саўгасаў і калгасаў,** павялічыць на 30 проц. ахоп батрацка-бядняцкай і серадняцкай масы сялянства і г. д.

Нарада адзначыла надзвычайна марудны тэмп беларусізацыі фізкультурнай працы, недастатковае пристасаваньне работы да патрэб нацыянальных меншасьцяй і слабое інтэрнацыянальнае выхаваньне фізкультурнікаў.

ЦЫВЭС.

МЕНСК

Назначэньне т. Васкабойнікава

СНК БССР узьняў хадайніцтва перад прэзыдыумам ЦВК аб назначэньні тав. Васкабойнікава намесьнікам старшыні ВСНГ БССР.

700 новых інструктароў фізкультуры

Усебеларуская нарада працаўнікоў фізкультуры пастанавіла падрыхтаваць у 1930 годзе 300 інструктароў фізкультуры для працы ў горадзе, з якіх 75 проц. —рабочых і 400 інструктароў для саўгасных, калгасных і вясковых гурткоў фізкультуры.

Нарада пастанавіла ачысьціць інструктарскія кадры ад сацыяльна-чужых элемэнтаў.

Зацьверджаны прыгавор над Насутай і Парсаковым

3-га студзеня Вярхоўны суд зацьвердзіў прыгавор па справе аб забойстве т. Варавы. Касацыйныя скаргі асуджаных да вышэйшай меры сацыяльнай абароны Насуты і Парсакова, а таксама Бэнэдыктава адхілены.

Менскі акруговы зьезд саюзу с.-г. рабочых

Учора ў Доме Селяніна адкрыўся 12-ты акруговы зьезд саюзу с.-г. рабочых. На зьезд прыбыла 150 дэлегатаў —батракоў, рабочых саўгасаў і с.-г. рабочых. На нарадку дня: зьезду—даклад аб дзейнасьці ЦП саюзу, даклад аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і калектывізацыі, становішча саўгасаў БССР і выбары праўленьня саюзу.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

У суботу, 4-га студзеня, а 8 гадз. увеч. у клюбе саўгандальслужачых пачынаецца праверка партквалектыву швэйнай фабрыкі «Кастрычнік». Запрашаюцца ўсе рабочыя.

Праверком працуе кожны дзень на ф-цы «Кастрычнік» у 11 гадз. раніцы.

4-га студзеня 1930 г., а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне **цэнтральнага штабу па правядзеньні 3-х месячніка беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменшасьцяй** з наступным парадкам дня:

Паведамленьне ЦП саюзу працасьветы аб мерапрыемствах па ўдзеле асьветнікаў у 3-хмесячніку (т. Рычкоў).

Паведамленьне БелАПП'у аб мерапрыемствах па ўдзеле ў 3-хмесячніку (тав. Мурашка).

Плян работы штабу (т. Шоламаў).

Мерапрыемствы па ўдзеле пінэр. арганізацыі ў 3-хмесячніку (т. Рывін).

Аб лёзунгах, плякатах і рэкляме 3-хмесячніку.

Аб стварэньні сэкцый пры штабе.

Аб вылучэньні пяцёркі для кіраўніцтва бягучай работай.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы (партгабінэт). **А 7-й гадз.** адбудзецца нарада прапагандыстых адзінай партшколы, разам з старастатамі груп.

Клюб навук. прац. Працяг вечару самакрытыкі мэдфаку. Пачатак а 8 гадз.

Пэдгабінэт. А 7 гадз. сход сэкцыі антырэлігійнага выхаваньня. А 8 гадз. заняткі гуртка па маляваньні для настаўнікаў і канцэнтру і па пэдалёгіі.

Біржа працы. А 7 гадз. увеч., у клюбе мэдсанпрацы агульны сход беспрацоўных разумовай сэкцыі. Пасьля сходу кіно.

Менскі АК КП(б)Б 4-і—1930 г., а 8 гадз. увеч. у памяшканьні АК (3-ці паверх) склікае **нараду камуністых,** мабілізаваных для работы ў калгасах.

Павінны зьявіцца наступныя т. т.: Сабалеўская (акрана), Мільнер (галянтарэйная ф-ка), Гурэвіч, Гулік і Сташэўская (ф-ка «Прагрэс»), Юшкевіч («Чырвоны Тэкстыльшчык»), Мажэйка (прыгарадны сельсавет), Азернава (парсувязь), Гальпэрына (зав. «Камунар»), Малеўская (хлебазавод), Блажко (Белдзяржбуд), Дазорцава (працасьветы), Зянькевіч (ЦВК БССР), Пятроўская (НКГандаль), Анішчанка (ЦВК), Вішынская («Чырвоны Тэкстыльшчык»), Казлова (ЦСУ), Маслова (РЗЛ), Гурыновіч (ф-ка «Кастрычнік»), Байдаліна (акрфа), Вулко, Каменецкая, Шварц (саюз працасьветы), Лібо (нархарч), Калініна (парсувязь), Драздоўская (ЦВК), Самахвалава (НКФ), Сухоцкая, Ліўшыц, Вялікая (МЦРК), Камінская (парсуд), Крэсік (Камунбанк), Лібман, Кажучыц (малочсаюз), Дарафеева, Наніба, Пастуховіч, Праліч, Жур, Уладзімірава, Цыльке (чыгунка), Буклей (ЦК ЛКСМБ), Айзэнберг (з-д «Бальшавік»), Пракофьева (саюз хэмікаў), Лашкевіч (з-д «Энэргія»), Таўгіна (Белсамрамсаюз), Дзіцерштэйн (НКФ), Багданава (дом грудзнога дзіцяці), Чэкарская (страхкаса), Плоткіна (Кастр. райком), Слонімская (саюз саўгандальслужачых), Герман і Васільлева (Белкаапсаюз).

ЗАЎТРА

У памяшканьні АК МОПР'у а 7 гадз. увечары адбудзецца вечар выпуску курсаў нізавога мопраўскага актыву.

Правілы прыёму ў Камуністычны Унівэрсытэт Беларусі імя Ў. І. Леніна на 1930-31 навуч. год

Камуністычны Унівэрсытэт Беларусі імя Ў. І. Леніна зьяўляецца вышэйшай партыйнай школай Беларусі і ставіць сваёй задачай падрыхтоўку кваліфікаваных партыйных працаўнікоў для сельскіх раёнаў, калгасаў-саўгасаў і прамысловых цэнтраў БССР.

-. У Камуністычны Унівэрсытэт прымаюцца т. т., якія задавальняюць наступным умовам:

а) Вытворчы стаж у прамысловасьці, або ў сельскай гаспадарцы ня менш 3-х год:

б) Ня менш 4-хгадовага партыйнага стажу (4 поўныя гады да 1-га верасьня 1930 г. без замены стажам ЛКСМБ) пры ўмове актыўнае партыйнае работы;

в) Узрост ад 22-х да 33-х год;

Увага: 1. Пры ўсіх гэтых умовах перавага дасцца чырвонаармейцам, удзельнікам грамадзянскай вайны.

Увага: 2. Выключэньні ў адносінах да партстажу дапускаюцца толькі для партыек, работніц і сялянак, партыйцаў, што знаходзяцца на актыўнай камсамольскай рабоце, але ня ніжэй 3-хгадовага партыйнага стажу (да 1-га верасьня 1930 г.).

2. Для паступаючых у камвуз уводзіцца аднагадовая дакамвузаўская падрыхтоўка па праграме, якая ўстаноўлена камвузам БССР. Дапушчаныя да прыёму павінны мець наступныя веды: уменьне арыентавацца ў палітычных падзеях бягучага дня: разуменьне пастаноў партыйных зьездаў і канфэрэнцый, VI Кангрэсу Камінтэрну і апошніх пленумаў, зьезду ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б; веды па гісторыі партыі ў разьмеры падручніка Папова і правільнае ўяўленьне аб палітыцы партыі ў пасьля кастрычнікавы пэрыяд. Па гісторыі клясавае барацьбы і палітэканоміі неабходна мець веды ў разьмеры курсу партшколы II ступені.

Увага: Падрабязныя праграмы, у межах якіх будзе весьціся падрыхтоўка і правяраецца на прыймовых выпрабаваньнях, будуць разасланы унівэрсытэтам усім дапушчаным да выпрабаваньня і ў акругкомы КП(б)Б.

3. Скончыўшыя сапартшколы II ступені могуць быць прыняты толькі пасьля 2-хгадовае практычнае работы і непасрэдна на 1 курс (ад дакамвузаўскае падрыхтоўкі вызваляюцца).

4. Асобы з заразнымі (у тым ліку вэнэрычнымі) хваробамі; нэўрастэніяй у запяжнай форме, сухотамі і наогул фізычна-слабыя ў Камунівэрсытэт ня прымаюцца.

Увага: Інваліднасьць сама па сабе ня можа служыць перашкодай для паступленьня ў Камунівэрсытэт.

5. З мэтай папярэдняй праверкі жадаючых паступіць у Камвуз пры АК КП(б)Б ствараюцца акруговыя адборачныя камісіі ў складзе заг. АПА (старшыня), заг. арганізацыі і прадстаўніка жаданьдзелу. Пры гэтых-жа камісіях утвараецца і мэдычны агляд камандыруемых.

6. Праўленьне Камунівэрсытэту мае права пасылкі ў адборачныя камісіі пры акругкомах свайго прадстаўніка для ўдзелу на месцы ў адборы кандыдатаў.

7. Усім партыйным арганізацыям, якія камандыруюць кандыдатаў, прапануецца з максымальнай уважлівасьцю аднесьціся да выбару накіроўваемых у Камвуз, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу як на падрыхтаванасьць камандыраваных, так і на сацыяльнае становішча, партыйны стаж і стаж актыўнае партыйнае работы, а таксама і на падбор кандыдатаў з ліку работнікаў нізавых фабрычна-заводзкіх ячэек. Алабраныя камісіяй кандыдатуры зацьвярджаюцца на пасяджэньні бюро АК КП(б)В. Адказнасьць за правільны адбор у адпаведнасьці з вышэйпамянёнымі ўмовамі і своячасовае выкананьне разьвёрсткі ўскладаецца на сакратара акругкому.

8. Усе адабраныя кандыдаты павінны абавязкова ўласнаручна запоўніць рассылаемую асабовую картку і напісаць свой жыцьцяпіс. Сьпісы намечаных да камандыраваньня акругкомы высылаюць у Камунівэрсытэт з наступнымі дакумантамі на кожнага камандыраванага: 1) асабовую картку, пасьведчаную адборачнай камісіяй, 2) жыцьцяпіс, 3) спраўку аб стане здароўя, 4) водзыў аб апошняй грамадзка-партыйнай працы, 5) расьпіску яго ў тым, што ўмовы прыёму яму вядомы.

9. Пачынаючы з 1-га кастрычніка 1929 г. зацьвярджаныя АК КП(б)Б і дапушчаныя мандатнай камісіяй унівэрсытэту да прыймовых выпрабаваньняў кандыдаты праходзяць дакамвузаўскую падрыхтоўку для паступленьня ў камвуз па рассыланых праграмах.

Мясцовыя партарганізацыі павінны аказваць усямерную дапамогу ў падрыхтоўцы накіроўваных.

10. Усім дапушчаным мандатнай камісіяй да прыймовых выпрабаваньняў даецца 2-хмесячны водпуск для падрыхтоўкі з захаваньнем пэнсіі па тэй установе ці прадпрыемстве, дзе накіроўваныя працуюць.

11. У камунівэрсытэце студэнты забясьпечваюцца па вызначаных нормах інтэрнатаў стыпэндыяй, харчаваньнем, пасьцельнай бялізнай, абмундыраваньнем, вучэбнымі падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Унівэрсытэт не бярэ на сябе ніякіх абавязацельстваў на забесьпячэньне кватэрамі сем'яў студэнтаў.

12. Камандыруючыя арганізацыі павінны:

а) прыняць на свой рахунак дарожныя выдаткі камандыраваных (аплата праезду абавязкова ў абодвы канцы);

б) прыняць на сябе апеку аб сям'і студэнта, якая застаецца на месцы;

в) паклапаціцца, каб камандыраваныя мелі з сабой бялізну, абутак, верхнюю вопратку, прынамсі, на 1-шы год навучаньня;

г) прыяжджаючы у КУБ павінен прадставіць: 1) камандыровачнае пасьведчаньне, 2) асабовую справу або вучотна-партыйную картку, 3) вучотна-вайсковы білет або другі дакумант, які сьведчыўбы ад адносінах да вайсковага вучоту.

13. Прыймовыя выпрабаваньні будуць праводзіцца ў Камунівэрсытэце (Унівэрсытэцкая 27) тэрмінам з 20-га па 27-га жніўня 1930 г.

14. Нівытрымаўшыя выпрабаваньняў ці не падыходзячыя пад умовы прыёму па стане здароўя або не прадставіўшы ўсіх неабходных дакумантаў будуць варочацца назад на месца ранейшай працы, якая захоўваецца за паступаючымі да канчатковага высьвятленьня аб іх паступленьні ў Камунівэрсытэт.

15. Агульны кантынгэнт набору па падрыхтоўчы курс вызначаецца 200 чал., з якіх:

Менску—40 чал., Гомелю—35 чал., Віцебску—30 чал., Бабруйску—25 чал., Магілеву—20 чал., Воршы—18 чал., Полацку—16 чал., Мазыру—16 чал.

16. У наступным нав. годзе вызначан дадатковы набор слухачоў непасрэдна на 1 курс унівэрсытэту ў ліку 25 асоб, скончыўшых губсаўпартшколы, вячэрнія агульна-адукацыйныя курсы, вячэрнія рабфакі, г. зн. маючых агульную асьвету ў аб'ёме ня ніжэй сямігодкі.

У іншым (партстаж і іншыя) запатрабаваньні да гэтых таварышоў тыя-ж, што і да ўсіх.

17. Таварышы, якія знаходзяцца на адказнай партыйнай рабоце і здавальняюць усім запатрабаваньням прыёму і па тых ці іншых прычынах не папалі ў лік разьвёрсткі акругкомаў, могуць падаваць заявы непасрэдна ў Камунівэрсытэт, прыклаўшы ўсе патрэбныя водзыў правіл прыёму дакументы.

18. Заняткі ў Камунівэрсытэце пачынаюцца з 1-га верасьня 30 г.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Васілевіч.**
Загадчык АПА ЦК КП(б)Б **Сянкевіч.**
Рэктар Камунівэрсытэту Беларусі імя Ў. І. Леніна **Саевіч.**

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ДА ВЕСНАВОЙ С.-Г. КАМПАНІІ 1930 г.

ДРУКУЕЦЦА І ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫХОДЗІЦЬ БРАШУРА

Міх. ПАБАДАЕВА

„БАЛЬШАВІЦКІМ ТЭМПАМ"

(Работа камсамопу ў веснавую с.-г. кампанію 1930 г.)

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяніце па тэл. 7-81

КУПЛЮ ПІЯНІНА ці РАЯЛЬ

Зьвярнуцца ад 9 г. ран. да 8 г. увеч. па адрасе: рог Камсамольскай і Карла Маркса, 46-22, кв. 15, БЛЕСЬНІКАВУ.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Субота, 4 студзеня—для саюзу мэдсанпрацы. Білеты ў саюзе і мясцкомах. Астача білетаў у рабкасе і ў касе тэатру.

Прэм'ера Э. ТОЛЬЛЕР

ГОП-ЛЯ, ЖЫВЁМ

Пачатак спэктакля а 8 гадз. 30 мін. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Вясёлая кам. у 6 ч. вытворчасьці „Межрабпом-фільм"

120.000 НА ГОД

ЗВЫШ ПРАГР. КІНО-ХРОНІКА Савкіно № 71

Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. Каса—ад 5 гадз.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Па прычыне вялікага посьпеху 2-гі тыдзень

Выключна дакумэнтальны фільм

САЛАЎКІ (Салавецкія лягеры асаблівага прызначэньня)

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

СЬМЯРОТНЫ НУМАР

Драма з цыркавога жыцьця ў 6 частках.

ЗВЫШ КІНО-ПРАГР. ХРОНІКА Савкіно № 70

Пачатак а 7 гадз. увеч. Каса ад 5 г. 30 м

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" (Будынак кіно „Пралетары")

Танька-Шынкарка

мэлё-драма ў 6 частках паводле аповесьці Кастуся Мінаева „ПРОТИВ ОТЦА"

Каса адчынена штодзенна ад 2 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

З панядзелка, 30 сьнежня — нямецкі! баявік

СКРЫПАЧ З ФЛЁРЭНЦЫІ

драма ў 7 част.

У галоўных ролях сусьветны артыст КОНРАД ВЭЙДТ і Елізавета БЭРГНЕР

СЁНЬНЯ 4 СЭАНСЫ:

Пачатак 1-га сэансу—а 6 гадз.
2-га „ —а 7 г. 30 м.
3-га „ —а 9 гадз.
4-га „ —а 10 г. 45 м.
Каса—ад 5 гадз.

В БЛИЖАЙШЕЕ ВРЕМЯ ВЫХОДИТ ИЗ ПЕЧАТИ

СПРАВОЧНОЕ ИЗДАНИЕ ДЛЯ РАБОТНИКОВ ПРОМКООПЕРАЦИИ

„СПУТНИК КУСТАРЯ—ПРОМЫСЛОВИКА И РЕМЕСЛЕННИКА на 1930 год"

КРАТКОЕ СОДЕРЖАНИЕ: табель-календарь старой и пятидневной недели. Нерабочие дни, годовщины и особые дни. Государственное и административное устройство СССР. Народное хозяйство СССР. 5-летний план народного хозяйства. Пятилетка промкооперации. Промкооперативная система. Законы о кустарях и промысловой кооперации. Справочные сведения общего характера и по промкооперативной системе. Производственный отдел (советы, указания, нормы, таблицы и расчеты), учебные и учебно-показательные учреждения. Цена справочника—65 коп. за экземпляр.

ВЫСЫЛАЕТСЯ НАЛОЖЕННЫМ ПЛАТЕЖОМ

Заказы направлять: МОСКВА, ЦЕНТР, ПЕТРОВКА, 12. РИО ВСЕКОПРОМСОЮЗА.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" НЕАБХОДНА ВЫПІСВАЦЬ КОЖНАЙ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙЦЫ, КОЖНАМУ КАМУНІСТУ

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1930 год

на часопісь „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" ОРГАН ЦК КП(б)Б

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" орган ЦК КП(б)Б в 1930 году рэарганізуецца ў бок большага тэарэтычнага нахілу ў асьвятленьні пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" будзе выходзіць рэгулярна штомесячна памерам 7-8 друкаваных аркушоў.

У „БАЛЬШАВІКУ БЕЛАРУСІ" уводзяцца новыя аддзелы і пашыраецца „Крытыка і бібліяграфія".

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" ў 1930 г. дасьць шэраг артыкулаў на палітычна-эканамічныя тэмы—аб Польшчы, Літве і Латвіі. Будзе грунтоўна асьветлена палітычнае жыцьцё Заходняе Беларусі і значэньне братняе КПЗБ.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" будзе рэгулярна асьвятляць яго саваё змаганьне ў горадзе і на вёсцы, бязьлітасна змагаючыся з усякімі адхіленьнямі ад генэральнае лініі партыі.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" — ваяўнічы орган тэарэтычнае думкі партыі.

ПАДПІСКА на 1930 год будзе прымацца канторою газэты „Зьвязда", паштовымі аддзяленьнямі контр-агенцтва, пэрыодсэктарам Бел. аддз. ПГЗ'а РСФСР, кнігарнямі Белдзяржвыдавецтва Белкаапсаюзу.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" (12 нумароў) каштуе на год — 4 р. 20 к., на поўгода—2 р. 10 к., на 3 м.—1 р. 05 к. на 1 м.—35 к.

ЗДАВАЙЦЕ ПАДПІСКУ! Адрас рэдакцыі: г. Менск, ЦК КП(б)Б

Кожная гарадзкая і вясковая партыйная і камсамольская ячэйка, кожны агітатар, прапагандысты, цэхавы, групаны і зьвенавы арганізатар, кожны партыйны актывісты—павінен падпісацца на часопісь.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"

Орган ЦК КП(б)Б.—Выходзіць 2 разы ў месяц.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—абагульвае вопыт партыйнай работы, зьмяшчае кіраўнічыя артыкулы па партыйным будаўніцтве і пытаньнях гаспадарчай і культурнай работы, з пункту гледжаньня партыйнага кіраўніцтва.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—вывучае вопыт і практыку партыйнай работы на месцах, асьвятляе работу нізавых партыйных арганізацый, абгаварвае матоды і задачы партыйнай работы, высьвятляе дадатны вопыт работы і пераносіць яго на ўсе ячэйкі КП(б)Б.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—дае ўсе неабходныя для партыйнага работніка, агітатара і прапагандыстага матар'ялы—факты, лічбы па пытаньнях бягучай працы.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—дапамагае ў практычнай рабоце нізавым кадрам партработнікаў, сакратаром і Агітпропам, членам бюро ячэек, кіраўніком партасьветы, групоргам, цэхоргам, зьвенаргам і інш.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—асьвятляе чарговыя пытаньні камсамольскай работы з пункту гледжаньня партыйнага кіраўніцтва.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—ставіць на абгаварэньне новыя пытаньні партыйнай работы і кіраўніцтва, высьвятляе новыя формы партыйнай і масавай работы ў пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—рэгулярна зьмяшчае крытыку і бібліяграфію літаратуры па пытаньнях партыйнага будаўніцтва і масавай работы ў горадзе і вёсцы.

„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"—зьмяшчае партыйныя дырэктывы па важнейшых пытаньнях.

Падпіска прымаецца:

Галоўнай канторай газ. «Зьвязда» Менск, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльн. упоўнаважанымі.

Умовы падпіскі:

На 1 м-ц — 25 кап.
На 3 м-цы — 75 кап.
На 6 м-цаў 1 р. 50 кап.
На 1 год—2 р. 75 кап.

—— КОШТ АСОБНАГА НУМАРУ—15 кап. ——

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі, распаўсюджвайце часопісь „ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"!

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

МЕНСК Савецкая, 63.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1930 год

НА ШТОМЕСЯЧНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПОЛІТЫКІ, ЭКОНОМІКІ, ГІСТОРЫІ, КРЫТЫКІ

„ПОЛЫМЯ"

9-ТЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ ПАД РЭДАКЦЫЯЙ: Я. КУПАЛЫ, А. НЕКРАШЭВІЧА, М. ЧАРОТА, І. ШЫПІЛЫ.

„ПОЛЫМЯ" знаёміць з дасягненьнямі беларускай мастацкай літаратуры, літаратуры іншых народаў Савецкага Саюзу і чужаземнай, друкуючы романы, аповесьці, апавяданьні, п'есы, поэмы, вершы.

„ПОЛЫМЯ" друкуе матэрыялы па палітыцы, эканоміцы, гісторыі беларускай культуры і гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі.

„ПОЛЫМЯ" зьмяшчае шмат навуковых матэрыялаў па філёзофіі, марксызму і ленінізму.

„ПОЛЫМЯ" дае чытачу крытычныя матэрыялы аб беларускай літаратуры, літаратуры іншых народаў СССР і чужаземнай.

„ПОЛЫМЯ" дае на сваіх старонках багаты кнігапіс-бібліографію, занатоўвае ўсе зьявы беларускай культуры, дае хроніку культурн. жыцьця ўсяго СССР, а таксама замежных краін.

У „ПОЛЫМІ" бяруць удзел самыя выдатныя літаратары, крытыкі, публіцыстыя і навуковыя сілы.

Часопісь „ПОЛЫМЯ" выходзіць штомесяц—12 кніжак на год, памерам кожная ў 10-12 аркушаў

У 1930 годзе ПАДПІСНАЯ ЦАНА ЗЬНІЖАНА з 12 на 10 рублёў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на 12 м.	на 6 м.	на 3 м.	КОШТ АСОБН. НУМАРУ
10 р.	5 р.	3 р.	1 рубель

МОЖНА ПАДПІСАЦЦА на ВЫПЛАТУ

ГАДАВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ у 3 тэрміны: пры падпісцы—4 р., да 1 ліпеня—3 р. і да 1 кастрычн.—3 р.

ПАЎГАДАВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ у 2 тэрміны: пры падпісцы—3 руб. і да 1 чэрвеня—2 руб.

Падпісчыкам, якія заплацяць адразу ўсе грошы, ДАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ЛЬГОТЫ:

ГАДАВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ: дарма комплект „ПОЛЫМЯ" на 1928 або 1929 год і пры куплі мастацкай ды палітычнай літаратуры выданьняў БДВ (на суму да 30 р.) скідка ў 25%

ПАЎГАДАВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ: пры куплі мастацкай і палітычнай літаратуры выд БДВ (на суму да 20 р.) скідка ў 15%

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: БЮРО ПАДПІСКІ Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва (Менск, Савецкая, 63), Цэнтральнай кнігарняй Беларускага Дзяржаўнага Выд-ва (Менск, рог Леніна-очай і Савецкай), усімі акруговымі аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, аддзелам падпіскі Беларускага аддзяленьня ГІЗ'у РСФСР (Менск, Савецкая, 54) яго агентурай на вакругах і раёнах, усімі пашчтова-тэлеграфнымі канторамі і аддзяленьнямі, Беларускім аддзяленьнем выдавецтва «Правда» (Менск, Савецкая, 61) і яго пад'аддзяленьнямі, канторай газ. «Беларуская Вёска» (Менск Савецкая, 63) ды яе ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.

ЗГУБЛЕНА ДАМАВАЯ КНІГА д. № 16 Рубіна М. В. па Клясной вул. Лічыць несапраўднай.

По МАТЕМАТИКЕ и ФИЗИКЕ в ВУЗ'ы и пр. учебн. зав. успешно готовит учитель Белкин (многолетняя практика) Рыновская, 4, кв. 15.

Вопытны малады энергічны ГАЛОЎБУХ хоча зьмяніць месца. Горкі, Акадэмія В. І. Васільцову.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента